Гайнаўскія лаўрэаты ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

ВІШАНЬКА І ЁЖЫК ☞ 9

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 12 (2601) Год LI | Беласток, 19 сакавіка 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Працэс 11 — рабілі ўсе

У гэты раз у свята сарака мучанікаў адбыўся разгляд (ужо другі) справы, якая датычыла адзінаццаці членаў Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва". Яе галоўным героем быў сведка Роберт Скварко, які з паручэння беластоцкай дэлегатуры Найвышэйшай кантрольнай палаты правёў у тыднёвіку кантроль, а пасля заключэнняў якога Палата накіравала супраць членаў Праграмнай рады заяву ў пракуратуру.

Давалі свае паказанні сведкі. Двое з іх не з'явіліся ў судзе; не атрымалі павестак. Як першая давала свае паказанні Крыстына Дамулевіч, якая ў 2001-2002 гадах, якіх датычаць абвінавачанні, была дырэктарам аддзела культуры Гарадской управы Беластока.

— Ці ведаеце, у якой справе вас выклікалі ў якасці сведкі? — спытаўся суддзя Кшыштаф Казлоўскі.

— Толькі з таго, аб чым даведалася сама. У павестцы было: „У справе Ежы Х. і іншых".

Высвятляючы, што ёй вядома аб прызначаных ГУ датацыях на дзейнасць „Нівы" ў 2001-2002 гадах, Крыстына Дамулевіч сцвердзіла, што памятае няшмат. Запэўнівала, што кіраваны ёю аддзел выдаваў рашэнні аб прызначэнні датацый, раней аднак заявы былі кансультаваныя камісіяй культуры Гарадской управы, па рэкамендацыі раднага, прадстаўніка нацыянальнай меншасці:

— Усе няўрадавыя арганізацыі, не толькі меншасныя, перабольшвалі сумы ў каштарысах, каб атрымаць хоць трэць таго, што было ім патрэбнае. Мы ўсе ведалі, што так яно і ёсць. ГУ таксама ведала, што тыя сумы завялікія. Мы аднак разбіраліся і сумы датацыі паменшвалі. Не памятаю, як дакладна было ў выпадку „Нівы". Не было аднак у яе выпадку звароту перавышаных сум. У іншых выпадках, калі былі прызначаныя завысокія сумы, трэба было іх вярнуць у гарадскую касу.

Крыстына Дамулевіч падкрэсліла:

— „Ніва" не перакрочыла сваіх правамоцтваў. Разлічалася добра. Каштоўнае, што такія арганізацыі хочуць яшчэ рабіць штосьці для горада. Яны ўзбагачаюць культурную прапанову.

На больш за дзве з паловай гадзіны разгляду найбольш часу і ўвагі суд, пракурор (зноў чарговы) ды двух абаронцаў прысвяцілі кантралёру Роберту Скварко, эканамічнаму дарадчыку беластоцкай дэлегатуры НКП. Ён сам, даючы паказанні, адчытаў лісток за лістком найважнейшыя абвінавачанні палаты. Як мы ўжо пісалі шмат разоў, датычаць яны рахункаводчых пытанняў, звязаных з разлічваннем датацый Міністэрства культуры і іншых устаноў, значыць, перш за ўсё парушэнняў закону аб рахункаводстве. Таму галоўнымі абвінавачанымі ў справе з'яўляюцца тагачасны шэф Праграмнай рады Яўген М. і галоўны бухгалтар Марыя П. Інспектар Роберт Скварко шмат месца адвёў справам быццам бы завялікага тыражу ў заявах на датацыі.

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

Р. Скварко: Пасля таго, як я даў справаздачу з кантролю ў „Ніве", пайшоў у водпуск. Паведамленне ў пракуратуру падаў наш юрыст...

— Ці гэта некампетэнтнасць, ці свядомае дзеянне бухгалтаркі давялі да такой сітуацыі? — дапытваўся суддзя Казлоўскі.

— Цяжка мне сказаць. Галоўная бухгалтарка не мела кампетэнтнасцей вынікаючых з закону аб рахункаводстве, але з таго не вынікала, што фактычна не ўмее весці рахункаводчыя кнігі. Спадарыня Марыя П. вяла рахункаводчыя кнігі шмат гадоў. Не думаю, што гэта былі мэтанакіраваныя дзеянні, маніпуляцыя. Гэта больш вынікала з разгільдзяйства, — адказваў Роберт Скварко.

Роберт Скварко не ўмеў аднесціся да пытанняў абароны, якія датычылі такіх самых, падобных і цяжэйшых абвінавачанняў НКП наконт іншых меншасных арганізацый і іх часопісаў, што было прадметам кантролю НКП, а адносна якіх не падаваліся заявы ў пракуратуры:

— Гэта не я накіраваў паведамленне ў пракуратуру. Пасля таго, як я даў справаздачу з кантролю ў „Ніве", пайшоў у водпуск. Паведамленне ў пракуратуру падаў наш юрыст і было яно адобранае юрыдычным дэпартаментам Палаты.

Падобна выказаўся на пытанні аб шматасабовай адказнасці Праграмнай рады. Пасля зазначыў:

— Цяжка вызначыць, у якім перыядзе і якія былі сумы неналежных датацый. Кружылі яны каля 100 тысяч злотых.

Суд на канец роспытаў інспектара Скварко спытаўся:

— Ці можаце сказаць, што грошы выдаваліся на дзеянні не звязаныя з распаўсюджваннем меншаснай культуры?

— Цяжка было б зрабіць такія высновы. Усё, што Праграмная рада рабіла, мела сувязь з культурай, асабліва беларускай меншасці. Усё, улічыўшы таксама і зарплаты працаўнікам.

Сведкамі былі таксама: члены рэвізійнай камісіі Праграмнай рады ў гэтыя гады Вячаслаў Харужы і яе старшыня Алег Латышонак. Абодва падкрэслілі, што рэвізійная камісія не займалася рахункаводчымі дэталямі.

— Наша мэта — не кантроль рахункаводства, а рэалізацыя задач, — тлумачыў Вячаслаў Харужы, па прафесіі настаўнік.

— Да часу кантролю НКП не мелі мы ніякай заявы, што штосьці не так разлічваецца, — пераконваў Алег Латышонак, гісторык Універсітэта ў Беластоку.

На наступным разглядзе дадуць свае паказанні сведкі: былы галоўны рэдактар „Нівы" Віталь Луба, працаўнік адказваючы за меншасныя справы ў Міністэрстве ўнутраных спраў і адміністрацыі, а раней у Міністэрстве культуры Івона Гродзкая ды эксперт па рахункаводстве Анна Андрэйчук.

Раіна Стэфанчук

Выбары ☞ 2

Віктар Сазонаў

Апазіцыйныя кандыдаты з большага вядуць сябе так быццам выбары адбываюцца ў адной з дэмакратычных краін Еўропы. Усё адпаведна выбарчаму графіку — збор подпісаў, агітацыйныя ўлёткі, актыўнае наведванне рэгіёнаў, выступы кандыдатаў на самую вялікую пасаду перад прысутнымі на вуліцах, калі ўдаецца, зрэдку, то і ў залах...

Назіральнікі ☞ 2

Мацей Халадоўскі

„Задача гэтак званых «наглядальнікаў» — правакаванне канфліктных сітуацый у час правядзення выбараў на прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і дэстабілізацыя сітуацыі ў краіне". Пасол Латушка асцерагаў таксама еўрадэпутатаў, якія выбіраюцца 19 сакавіка ў Беларусь: „Гэтыя еўрадэпутаты свядома ідуць на канфлікт...

Аграгурызм ☞ 4

Міхал Мінцэвіч

3. Галёнка: Наша грамадства беднае, некаторым школам задорага плаціць па чатыры злоты за асобу; ад непрацаздольных дзяцей грошай не бяру. Наведвальнікаў штораз менш: чатыры гады назад было іх паўтары тысячы, а зараз, хаця цікавінак на гаспадарцы прыбывае і больш рэкламую яе, лік гасцей пастаянна меншае...

Трагедыя Кашалёў ☞ 8

Аляксей Мароз

Савецкія салдаты, якія гналі немцаў, абстрэльвалі нашу вёску з-пад Рудутаў. Тады загінула некалькі нашых жыхароў і знішчаны былі будынкі. Спачатку немцы адстрэльваліся, а пасля адступіліся на ўзгорак побач Спічкоў і адтуль сталі абстрэльваць рускія войскі. На гэтым узгорку было пад 20 нямецкіх салдат, але бараніліся яны доўга...

Падземная Нарва ☞ 11

Мікалай Лук'янюк

У Нарваўскай гміне найгорш пакрыўджаная паўночная частка, г.зн. вёскі распаложаныя на правым беразе ракі Нарвы. Калі ў папярэднім скліканні старшынёю Гміннай рады быў Мікалай Кандрацюк, дык было яшчэ сяк-так. Цяпер, калі я пацікавіўся ў некалькіх солтысаў працай гмінных радных, то ў адказ пачуў, што М. Кандрацюк, калі бывае на сесіі Рады гміны, то ціхенька...

9 770546 196000

Тры Аляксандры

Ну вось і надышоў апошні тыдзень перад маючымі адбыцца 19 сакавіка прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі. Тыдзень самай актыўнай агітацыі і самага жорсткага змагання за сімпатыі выбаршчыкаў. Тэарэтычна. На практыцы выглядае трошкі па-іншаму. Беларускае заканадаўства з аднога боку забараняе агітацыю ў дзень выбараў, а з іншага боку дазваляе грамадзянам Рэспублікі Беларусь у гэты апошні тыдзень, які яшчэ адведзены на агітацыю, прагаласаваць датэрмінова, не дачакаўшыся апошніх, сама прыгожа і разумна зробленых агітацыйных матэрыялаў. І, як паказвае практыка і сцвярджае статыстыка папярэдніх выбараў, колькасць беларусаў ахвотных прагаласаваць датэрмінова з кожным разам расце. Расце прама прапарцыянальна росту актыўных службовых асоб, якія настойваюць, каб іх падначаленыя прагаласавалі да таго дня, калі камісіі высыплюць на стол бюлетэні і пачнуць лічыць галасы. Пакуль што ўсё бесперабойна ідзе па сцэнарыю ўлады. Трэба аддаць ёй належнае — пабудаваць моцную сілавую структуру ёй удалося. Як казаў герой аднаго любімага дзіцячага мультфільма Чабурашка: „Мы будавалі, будавалі, і... пабудавалі".

Апазіцыйныя кандыдаты з большага вядуць сябе так быццам выбары адбываюцца ў адной з дэмакратычных краін Еўропы. Усё адпаведна выбарчаму графіку — збор подпісаў, агітацыйныя ўлёткі, актыўнае наведванне рэгіёнаў, выступы кандыдатаў на самую вялікую пасаду перад прысутнымі на вуліцах, калі ўдаецца, зрэдку, то і ў залах. Праўда, іх паводзіны сталі рэзка адрозніваццa ад паводзін кандыдатаў на мінулых выбарах. Найперш у актыўнасці і рашучасці. Аляксандр Казулін ужо нажыў сабе дзве крымінальныя справы, а Аляксандр Мілінкевіч на ўсю краіну, з блакітных тэлеэкранаў заявіў, што будзе лічыць Аляксандра Лукашэнку „трусом", калі той адмовіцца ад тэледэбатаў з ім. Дзеючы прэзідэнт аніяк не адрэагаваў на гэты заклік.

Надзвычайная актыўнасць з'явілася і ў дзяржаўных тэле-, радыё- і газетных журналістаў. Яны і раней не абміналі магчымасць расказаць якія-небудзь „страшылкі" пра апазіцыю, але зараз на іх нібы надышло праясненне мазгоў і яны цалкам разабраліся хто гэта такія „страшныя людзі з апазіцыі". Дайшло нават да шпіёнаманіі. Паслухаўшы іх, прыходзіш да высновы, што паўсюль адны ворагі. Прычым ворагі твае, асабістыя. Ну, яны яшчэ трошачкі ворагі і галоўнаму твайму заступніку, кармільцу і паільцу, мудраму і разумнаму дзеючаму прэзідэнту, на якога, паводле іх высноваў, толькі і надзея.

Простыя людзі таксама не без актыўнасці абмяркоўваюць постаці трох Сашаў — Мілінкевіча, Казуліна і Лукашэнкі. Пра Сярожу Гайдукевіча ўжо забыліся. Ды і ён сам хіба забыўся, што таксама ў спісах прэтэндэнтаў на прэзідэнцтва. Ну і Сашы не губляюць часу на абмеркаванне яго кандыдатуры. Больш занятыя стасункамі паміж сабой. Казулін нават прапанаваў Мілінкевічу зняць свае кандыдатуры. Маўляў, у такіх умовах хай Лукашэнка адзін балатуецца. Мілінкевіч працягвае актыўна запрашаць людзей прыйсці пасля выбараў на плошчу ў Мінску, і, як гэта робіцца ва ўсіх еўрапейскіх краінах, там і дачакацца абвяшчэння вынікаў і разам, публічна, адсвяткаваць перамогу. Нават Зянон Пазьняк змякчыў да яго ў апошніх выказваннях тон. Хоць ад сваёй ідэі народнага галасавання не адмовіўся. І таксама заклікае на плошчу. Ды і Казулін не супраць плошчы. Але сітуацыя складваецца так, што апазіцыйныя актывісты маюць усе шанцы даведацца пра вынікі выбараў у цяпле і ўтульнасці міліцэйскіх пастарункаў і ізалятарах часовага затрымання, бо сілавыя структуры беларускай дзяржавы хутчэй за ўсё забыліся што такое сон. Пад заявы міжнародных структураў пра недапушчэнне сілавога ціску яны працягваюць праводзіць вышукі, арышты, затрыманні, выкліканні, зачыняюць арганізацыі, заводзяць адміністрацыйныя і крымінальныя справы... Адным словам, застаюцца вернымі старому чэкісцкаму лозунгу — „служба дні і ночы". Часамі здаецца, што вынікі выбараў залежаць толькі ад іх, што гэта і ёсць самая актыўная структура выбарчага працэсу. Мітусяцца як вясковая мяцёлка. Адпачыць спадзяюцца пасля выбараў. Толькі ці атрымаецца? Бо як сцвярджае гісторыя, пасля выбараў могуць пачацца працэсы затрымання ўжо іх саміх. Прытым незалежна ад таго, які з трох Аляксандраў пераможа на выбарах...

Віктар Сазонаў (Гродна)

Праз памежны роў

Дзе тыя хацінкі ў мальвах, у блакітных аканіцах? Дзе аднасямейныя домікі ў агародах, дамкі ў садах? Дзе сляпыя студні, дзе серп убіты ў праўшняк дзвярэй ад падворышча? Дзе прафесараў дом з вялікай зашклёнай верандай, калі ў паўзмрок за шыбінай хісталася штосьці бы прамень свячы; ці гэта хто там меў не спаць усю доўгую ноч, гаспадар ці мо анёл? Дзе званіца блакітнай царкоўкі?

Дзе ранак, летам, зараз пасля прабуджэння, дзе залатая сцежка да сонца і разагрэты гравій сцяжыны, які ў босыя ступакі коле? Дзе бег да бяздыху, уцёкі або пагоня? Адным словам, як мне назваць вяртанне ў даліну дзяцінства, калі вяртанні немагчымыя, дарэмныя, калі наканавана ім параза? „І вечныя канікулы, і тых канікул мала", — гэтак убраў у словы тое настальгічнае вяртанне шалёны паэт Анджэй Бабінскі. Куды дзеліся тыя цудоўныя людзі, быццам тыя стражнікі каштоўнасцей?

Паводле выбітнага рэлігіязнаўцы Мірчы Эліядэ традыцыйныя грамадскасці, першабытныя, бытавалі як сведкі раю. Усе сферы іх жыцця: праца, спачын, паляванне, вайна, каханне, мілаванне пранікнутыя былі святасцю, сакрумам. Ці мы ў старой Еўропе, мы, яе жыхары, забыліся на дзяцінства чалавецтва? Вось бог пакідае нашу экзістэнцыю і разам з яго адыходам расце пустыня, прастора на людскую свабоду. Свабода — свецкая, яна — прафанум. Свабода — цяжар і не адзін з нас марыць аб святой неадказнасці, аб вечнажывых добрых бацьках, якія гарантуюць нам бяспеку на ўсе часы.

А яшчэ так нядаўна, ледзь момант таму, гісторыя свету здавалася быць працэсам узмацнення індывідуалізму, магутнасці чалавека, гуманізму, вызвалення індывідуума з усіх кайдан і путаў. Тым часам назіраем вось змену напрамку хвалі перамен. Бывае, што грамадскія навукі адмаўляюць чалавечаму індывідууму правоў чалавека. Іх свяцілі падаюць нам ідэі аб шырокіх, аграмадных структурах, якія людскую асобіну дэтэрмінуюць, абмяжоўваюць. Тыя структуры быццам бы мацуюцца на п'едэстале былога бажаства. Маюць гэта быць эканамічныя, біялагічныя ці нацыянальныя структуры.

Трэба было б верыць адно ў тое, што вяртанне ў краіну дзяцінства — у сапраўднасці вяртанне ў Еўропу, якая на дадатак расцягваецца на агромных прасторах ад Атлантыкі па Ціхі акіян, аж да межаў Манголіі і Кітая. Яна таксама — наша айчына. Крытыкі Еўропы і яе спадчыны, а такія ёсць ад правага боку да лявіцы, хочуць нам адняць нашу іудзея-хрысціянскую традыцыю. Без гэтай традыцыі няма ніякай Еўропы, без тае традыцыі цікуе за спіной прадонне.

Тэрарысты даўняга тыпу, самотныя рыцары, учынялі замахі на каранаваныя галовы, на армейскіх камандзіраў ці паліцыянтаў. Замахваліся ў імя свабоды. Сённяшнія тэрарысты здаюцца не верыць у каштоўнасць паасобнага чалавека, бадзёра ўступаюць на шлях генацыду.

Ежы Плютовіч

Беласток, 6 сакавіка 2006 г.

Паважанае Спадарства!

Ад імя свайго і Управы літаратурнага аб'яднання беларускіх пісьменнікаў Польшчы, згуртаваных у „Белавежы", віншую ўсе — дагэтуляшнія і цяперашні — рэдакцыйныя калектывы „Нівы" з юбілеем залатога 50-годдзя.

„Ніва" сыграла ў свой час выдатна-неацэнную ролю ў станаўленні і развіцці беларускай літаратуры ў Польшчы, была крыніцай беларусазнаўчых ведаў, актывізавала культурна-асветную дзейнасць, абуджала нацыянальную годнасць.

„Белавежцы" застаюцца па-сыноўняму ўдзячныя свайму пісьменніцкаму лёсу за тое, што напачатку іх шляху была „Ніва".

Старшыня Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа"

Ян Чыквін

Вачыма еўрапейца

Назіральнікі

— З прыкрасцю інфармуем, што па прычынах незалежных ад польскага боку фактараў будзе магчымы выезд толькі сарака асоб. Выбар кандыдатаў зрабіла камісія пры ўдзеле прадстаўніка МЗС, — такую заяву можна прачытаць на сайце Фонду імя С. Баторыя, які займаўся арганізацыяй наглядальнай польскай місіі на нядзельныя прэзідэнцкія выбары ў Беларусі.

Некалькі дзён таму пасол РБ у Варшаве Павел Латушка заявіў: „Чакаем тых, каго запрасілі мы і не чакаем тых, каго не запрашалі. Таму не трэба ўсчынаць правакацый, таксама на межах". Раней аб тых асобах „з шэрагу дзяржаў, перш за ўсё мяжуючых з РБ", што выбіраюцца на беларускія выбары без адпаведных акрэдытацый, на сапраўды рэжымна-прапагандысцкай мове казаў: „Задача гэтак званых «наглядальнікаў» — правакаванне канфліктных сітуацый у час правядзення выбараў на прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і дэстабілізацыя сітуацыі ў краіне". Пасол Латушка асцерагаў таксама еўрадэпутатаў, якія выбіраюцца 19 сакавіка ў Беларусь: „Гэтыя еўрадэпутаты свядома ідуць на канфлікт, незалежна ад таго, што беларускі бок перадаў прадстаўнікам Еўрапарламента сваю пазіцыю ў справе немэтанакіраванасці такога візіту". Перш за ўсё цынічна заявіў: „Запрашэнне наглядальнікаў на выбары Прэзідэнта РБ сведчыць аб адкрытасці Беларусі". Падобна цынічна прагучалі словы Аляксандра Лукашэнкі, выказаныя ў сярэдняй вайсковай школе ў Мінску: „Калі мы ведаем, што пераможам, то чаго баяцца наглядальнікаў? У чым яны могуць перашкодзіць? Мы іх асцераглі, ведаюць наш закон: таму крок налева, крок направа — і ўжо вас тут заўтра няма". Калі так тое пытанне стаіць, спадар прэзідэнт, то чаму пагадзіліся вы на ўдзел у наглядальнай місіі АБСЕ толькі 450 асоб? Не дамся звесці прапагандысцкім прыёмам Лідзіі Ярмошынай, старшыні Беларускай цэнтральнай выбарчай камісіі, якая тлумачыла, што „польскае заканадаўства ўвогуле не прадбачвае вядзення замежных наглядальных місій" польскай Цэнтральнай выбарчай камісіяй, запрошанай афіцыйным беларускім бокам. Спадарыня старшыня, гэта не той адрас, не туды трэба было слаць запрашэнні.

— Беларускія ўлады зрабілі немагчымым выезд нацыянальных місій. Аб тым і аб ліку наглядальнікаў беларускі бок рашыўся ў размовах з прадстаўнікамі АБСЕ, Беларусі і Расіі, — сказаў „Ніве" арганізатар місіі АБСЕ ў Польшчы Куба Баратынскі з Фонду імя С. Баторыя.

Дадаў, аднак, прытым, што лік наглядальнікаў на кароткі і доўгі тэрмін (агулам з Польшчы чатырох) дастатковы, перш за ўсё для таго, каб скласці рапарт для Савета Еўропы. Так вось з Польшчы ў нядзелю мелі „глядзець на рукі" праводзячых выбары галоўным чынам маладыя людзі, ведаючыя знакаміта англійскую мову і разумеючыя беларускую і рускую (умеючыя чытаць са зразуменнем дакументы). Працаваць мелі ў групах — праўдападобна ў чатыры асобы.

У Польшчы шмат ахвотных да ўдзелу ў гэтай місіі расчараваліся. У Фонд імя С. Баторыя падалося больш за 500 асоб. Расчараваны перш за ўсё мінш. студэнты універсітэта ў Гданьску, хоць бы з факультэта паліталогіі. Лічылі, што магчымы будзе такі масавы „наглядальны выезд", як у выпадку выбараў на Украіне на хвалі аранжавай рэвалюцыі, у якіх удзельнічала больш за тысяча наглядальнікаў.

Думаючы аб нядзельных прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі і ўдзеле ў іх наглядальнікаў, прыгадалася мне парафраза слоў Іосіфа Сталіна, якую пачуў я нядаўна ад прафесара Яўгена Мірановіча:

— У выпадку Беларусі гэта не такое важнае, хто як галасуе, і як лічацца галасы. Тут яшчэ важнае, хто аб'яўляе вынікі выбараў.

Мацей Халадоўскі

Прэстыжны гайнаўскі ліцэй

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Эвеліна Пліс (справа), Андрэй Давідзюк і Каміла Пліс рады прывілеям, якія атрымалі дабіваючыся поспехаў у алімпіядах

У Агульнапольскім рэйтынгу сярэдніх школ, арганізаваным часопісамі „Перспектывы" і „Жэчпасполіта", у 2006 годзе Гайнаўскі белліцэй апынуўся на 40 месцы, а Бельскі белліцэй на 78. Калі вынікі перавесці на грунт Падляшскага ваяводства, то Гайнаўскі ліцэй заняў 4 месца, а Бельскі — 6. Перад Гайнаўскім белліцэем апынулася толькі адна школа з Беластока — I Агульнаадукацыйны ліцэй імя Адама Міцкевіча. Славуты III Агульнаадукацыйны ліцэй імя Кшыштафа Бачынскага ў Беластоку заняў пятае месца. У спаборніцтве, да якога прыступілі вучні сярэдніх школ рознага профілю, ацэньваліся поспехі ў алімпіядах.

— Найвышэйшую ацэнку школы атрымлівалі за лаўрэатаў у маштабе краіны. Ніжэй ацэньваліся фіналісты, але значэнне мела таксама колькасць алімпіядаў, у якіх вучні ўдзельнічалі ды перамагалі і колькасць вучняў у школе. Пасля падліку, паводле аднолькавай працэдуры, можна было параўнаць поспехі школ, якія прыступілі да спаборніцтва, — інфармуе дырэктар Гайнаўскага белліцэя Яўген Сачко.

У 2004/2005 навучальным годзе ў 30 алімпіядах прыняло ўдзел звыш 240 тысяч вучняў. Сярод іх 1 949 асоб стала фіналістамі, а 670 вучняў — лаўрэатамі. Хаця выводзіліся яны ажно з 784 школ, то да рэйтынгу кваліфікаваных было толькі 386 школ. Агульнаадукацыйны ліцэй з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы заняў добрае месца, бо 5 яго вучняў стала лаўрэатамі, а 12 фіналістамі. Школа дабілася поспехаў на ўзроўню краіны ў 3 алімпіядах, але самыя вялікія поспехі былі, зразумела, у Алімпіядзе беларускай мовы.

Агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім імя Браніслава Тарашкевіча можа пахваліцца 3 лаўрэатамі і 8 фіналістамі, якія ўвайшлі ў лік пераможцаў у 2 алімпіядах. Арганізатары рэйтынгу паінфармавалі, што не маглі параўнаць поспехаў у алімпіядах з матуральнымі вынікамі, бо толькі некаторыя акруговыя экзаменацыйныя камісіі рашыліся перадаць гэтыя вынікі. Аднак з вопыту папярэдніх гадоў відаць, што школы, якія дабіваюцца поспехаў у рэйтынгу, добра рыхтуюць вучняў да матуральных экзаменаў. У мінулым школьным годзе ўсе вучні Гайнаўскага белліцэя паспяхова справіліся з матуральнымі экзаменамі.

— Мы заўсёды заахвочвалі нашых вучняў да ўдзелу ў алімпіядах, бо карысць ад гэтага застаецца для вучняў, настаўнікаў і школы. Пераможцы на ўзроўні цэнтральных элімінацый алімпіядаў могуць без конкурсаў паступаць на многія аддзяленні вышэйшых устаноў. У дыдактычнай працы настаўнікаў таксама важна, каб паспяхова падрыхтаваць вучняў да алімпіядаў. Для школы прэстыж, калі яе вучні перамагаюць у спаборніцтвах, бо з іх вынікамі знаёмяцца бацькі нашых будучых вучняў, — кажа дырэктар Яўген Сачко.— Калі наш ліцэй стаў перамагаць у рэйтынгу алімпійцаў, да нас сталі паступаць вучні, якія ў гімназіях дабіваліся вельмі добрых вынікаў навучання. Напрыклад, на 128 асоб прынятых у 2005 годзе ў наш ліцэй, ажно ў 68 вучняў былі пасведчанні з чырвонымі палоскамі.

У мінулых гадах Гайнаўскі і Бельскі белліцэі маглі таксама пахваліцца добрымі вынікамі ў алімпіядах і высокімі месцамі ў апісваным мной рэйтынгу. У 2001 годзе Гайнаўскі ліцэй з дадатковым навучаннем беларускай мовы заняў 32 месца ў краіне, а Бельскі ліцэй у 2002 годзе заняў нават 8 месца ў краіне і два разы займаў высокія месцы ў трэцяй дзесятцы найлепшых школ.

— У плане развіцця школы на гэты год прадбачылі мы стварэнне праграмы вышукання здольных вучняў, з якімі пасля будуць маглі працаваць настаўнікі. Трэба яшчэ сумець пераканаць гэтых вучняў, каб хацелі рыхтавацца да алімпіядаў і конкурсаў. Я частку сваіх дырэктарскіх гадзін адводжу на пазаўрочныя заняткі, у час якіх настаўнікі працуюць са здольнай моладдзю, — гаворыць Яўген Сачко.

Да ўдзелу ў алімпіядах заахвочваюць вучняў не толькі прывілеі, якія тычацца льгот пры паступленні ў вышэйшыя ўстановы. Лаўрэаты і фіналісты атрымліваюць узнагароды. Пераможцы Алімпіяды беларускай мовы выязджалі на экскурсіі ў Беларусь, а Андрэй Давідзюк, фіналіст Алімпіяды рускай мовы, ездзіў на экскурсію ў Маскву.

— Да Алімпіяды беларускай мовы вучылася я многа часу, бо будучы яшчэ вучаніцай другога класа я мусіла засвоіць веды па праграме трэцяга класа. На ўроках і па-за імі вучылася я правільна пісаць творчыя працы, каб не рабіць памылак. Рыхтавалася таксама да вусных адказаў, у час якіх трэба было мець крыху шчасця. У некаторых пытаннях лягчэй праявіць веды і паказаць, што добра гаворыш па-беларуску, — кажа Эвеліна Пліс, якая заняла трэцяе месца ў цэнтральных элімінацыях.

— Мусіла я многа вучыцца, шукаючы матэрыялаў у разнародных часопісах і іншых крыніцах, — гаворыць Каміла Пліс. — Ад пачатку адукацыі ў гімназіі біялогія была маім хобі. Хачу я пакарыстацца прывілеяй, якую атрымала як лаўрэат Алімпіяды экалагічных ведаў (5 месца). Буду я прынята без адбору на факультэт біялогіі Варшаўскага універсітэта.

Каміла Пліс нядаўна атрымала стыпендыю Міністра нацыянальнай адукацыі. Актыўна дзейнічае яна ў экалагічным гуртку ў школе і этнаграфічным гуртку „Этна" пры Беларускім музеі ў Гайнаўцы.

— За тры тыдні, ад пачатку, перарабіў я матэрыял па праграме навучання рускай мовы ў сярэдняй школе, што прысвойваецца на працягу трох гадоў. Наша камісія цэнтральных элімінацый старалася спраўдзіць ці вучань свабодна валодае рускай мовай і таму яе члены ўступалі з намі ў свабодную размову, — тлумачыць Андрэй Давідзюк, які заняў 11 месца ў Польшчы. — Хачу я вучыцца на аддзяленні рускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, на якую буду прыняты без конкурсу і паступіць у Праваслаўную духоўную семінарыю.

У гэтым школьным годзе белліцэісты з Гайнаўкі і Бельска таксама дабіліся ўжо поспехаў у прадметных алімпіядах, але большасць цэнтральных элімінацый яшчэ перад імі. Ад канчатковых вынікаў будзе залежаць месца ў рэйтынгу, які будзе абвешчаны праз год.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Нядаўна гайнаўскія радныя прынялі пастанову аб будове крытага басейна пры будынку Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы.

— Як дырэктар школы і радны Гайнаўкі я цешуся, што здзейснілася мая мара і ў нашым горадзе распачнецца будова крытага басейна, — заяўляе Яўген Сачко. — Важна для нас, што басейн будзе будавацца пры нашай школе і закончыцца ўжо даўно распачатая інвестыцыя — будова дыдактычна-спартыўнага комплексу.

Праект будовы крытага басейна ўзнік раней, але ў мінулым годзе быў ён перапрацаваны. Між іншым, былі паніжаны кошты рэалізацыі інвестыцыі. Прадбачваецца, што будова будзе фінансавацца з гарадскога бюджэту і еўрасаюзных сродкаў, калі такія атрымаюць гарадскія ўлады. Хаця басейн узнікне пры школе, будзе агульнадаступным жыхарам горада і будзе ўтрымлівацца на сродкі гарадскога бюджэту.

— Прадбачваецца, што рэалізацыя інвестыцыі распачнецца ў ліпені гэтага года. Крэдыт размерам 1 мільёна злотых дазволіць выканаць фундаменты і выйсці на паверхню зямлі. Пасля плануем хадайнічаць за еўрасаюзныя сродкі, — гаворыць радны Яўген Сачко.

Роварам у Беласток

У міжваенны час нашы дубіцкія людзі, каб дабрацца ў нейкую вёску або мястэчка, найчасцей карысталіся сваімі нагамі або фурманкамі. Пасля некаторыя пакуплялі ровары, але іх было мала і толькі мужчыны на іх ездзілі ў Кляшчэлі, Гайнаўку, Орлю, Бельск-Падляшскі. Дарогі былі дрэнныя, але ровары былі моцныя і лёгкія. Калі адзін з маіх дзядзькоў жаніўся, дык дзед Шуль роварам паехаў аж у Лявіцкія, што каля Беластока, запрасіць сваякоў на тую ўрачыстасць. Справіўся ён з гэтай задачай паспяхова, бо быў яшчэ пры сілах.

Сёння таксама ёсць людзі, якія пераадольваюць далёкія маршруты на веласіпедзе. Мой сябра блізкія і далёкія мясцовасці наведвае толькі на ровары. Нядаўна паказаўся ён у тэлеперадачы з Беластока, дзе адказваў на пытанні журналіста наконт малочнай платы. Было гэта ў цэнтры Беластока, дзе шукаць паратунку сабраўся вялікі натоўп пакрыўджаных малочнай бюракратыяй сялян. Думку, што мой 64-гадовы сябра заехаў у Беласток на ровары, я адкінуў, бо не паверыў, што ён можа двойчы адолець адлегласць за шэсцьдзесят кіламетраў. Пасля я даведаўся, што мой сябра і сапраўды ў Беласток паехаў на ровары; гэтае дасягненне можна запісаць у кнігу рэкордаў Гінеса. На такія подзвігі трэба мець здароўе і моцныя ногі, але мы, беларусы, гэта ўсё маем.

Мікалай Панфілюк

Рамонт вадасховішча „Арлянка”

У гэтым годзе ўлады Дубіцкай гміны (Гайнаўскі павет) намераны мадэрнізаваць штучнае вадасховішча „Арлянка”. Неабходна перабудаваць галоўную плаціну, падмацаваць адхоны ды перш-наперш ачысціць дно ад мулу. Адначасова вадасховішча паглыбяць на 30-50 сантыметраў.

Вадасховішча „Арлянка” існуе ад 1986 года. Пабудавалі яго дзеля павышэння ўзроўню вады ў глебе ды захоўвання яе на час сухой вясны або лета, а таксама для адпачынку. На беразе яго пабудавалі домікі з начлежнымі месцамі, пункт пракату байдарак, водных валасіпедаў ды матрацаў, а таксама выдзелілі і загарадзілі палатачнае поле. Вакол вадасховішча ставяць дачы.

У сезоне над залівам найчасцей адпачываюць жыхары Гайнаўкі. Найбольш іх прыязджае ў летнія суботы і нядзелі.

Мадэрнізацыя вадасховішча каля Дубічаў-Царкоўных — прыярытэтная задача гмінных улад. Яны маюць ужо поўную дакументацыю ўсіх работ. Грунтоўнае аднаўленне заліва будзе каштаваць каля мільёна злотых.

(мох)

Дзесяць гадоў „Купалы”

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Твар у твар са страусам

Калі сёлета ў лютым наведаў я агратургас „Купала” ў Арэшкаве-Парыеве, сустрэў яго ўладальніка над палонкай на ставе, дзе ён мыўся ў ледзяной вадзе. Спадар Зіновій Галёнка раней служыў вайскоўцам на варшаўскім аэрадроме і любая зарадка яму не чужая. А загартоўвацца, як прызнаўся, яму неабходна, каб выстаяць пры рэалізацыі амбітных агратурыстычных планаў. Мінае ўжо дзесяць гадоў дзейнасці „Купалы” і пра-ктыкаванняў гаспадара ў гэтай яшчэ піянерскай на Падляшшы галіне турызму. Карыстаюся нагодай для размовы са спадаром Зіновіем Галёнкам.

— ***Каму патрэбная фірма „Купала”: уладальніку, наведвальнікам?***

— У фінансавым плане мне гэтая дзейнасць не мае ніякага сэнсу. Другога такога прасцяка, які б дакладаў да інтарэсу, не ведаю ў наваколлі.

Наведвальнікі не ўяўляюць, колькі ўсё гэта каштуе. Экскурсіі з-па-за Гайнаўкі захопленыя, віншуюць мяне. Знаёмяцца са звярынай, бо дзеці рэдка ведаюць жывёл; нават настаўніцы пытаюць: „А гэта што?” А я адказваю: „Гэта цацарка...” Дзеці, асабліва непрацаздольныя, вельмі цікавыя, заходзяць за агароджу, кормяць, і так захапляюцца, што пасля цяжка іх адтуль забраць.

— ***Якую жывёлу найбольш складана разводзіць у такіх гаспадарках?***

— Зараз не магу разводзіць дамашніх птушак, бо душаць іх куніцы і тхары, што прыходзяць з недалёкай пушчы. Але найбольшае спусташэнне, нягледзячы на сетчаву агароджу на падмурку, учыняюць спушчаныя з ланцугоў сабакі суседзяў.

Атруцілі мне трох страусаў; у гэтым я ўпэўнены, бо нядаўна, у снежні, атруцілі і майго сабаку ў загарадзе каля хаты. Маю прэтэнзіі да ветэрынарных службаў, бо адмовіліся праверыць, чым іх атруцілі, не прыехалі. У 2001 годзе атруцілі мне трох козлікаў.

Сабаку цяжка атруціць, гэта можа зрабіць толькі спецыяліст. Нехта труціць бяздомных сабак каля гарадской звалкі, бо хаця паяўляюцца новыя (людзі выганяюць), неўзабаве яны прападаюць. А мае сабакі ў загарадзе, не маюць выхаду навонкі.

— ***Як бачыце перспектывы для агратурызму?***

— Гаспадарка, ці звычайная, ці спецыялізаваная, патрабуе ўкладвання агромных сродкаў. Трэба ўтрымаць звярыну, працаўнікоў (рэабілітантаў, інструктара верхавой язды), дом (апал), аўтамабіль — усё гэта каштуе. А развіваць агратурыстычныя паслугі можна толькі пры ўмове, што будуць ахвотныя карыстацца такім адпачынкам.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Зіновій Галёнка

Наша грамадства беднае, некаторым школам задорага плаціць па чатыры злоты за асобу; ад непрацаздольных дзяцей грошай не бяру. Наведвальнікаў штораз менш: чатыры гады назад было іх паўтары тысячы, а зараз, хаця цікавінак на гаспадарцы прыбывае і больш рэкламую яе, лік гасцей пастаянна меншае. Зімою зусім няма зацікаўлення.

— ***Ці агратурызм будзе развівацца?***

— Я ў гэта не веру. Патрэбны сістэмныя рашэнні, а тут уключаецца палітыка. Просты вясковец, які хацеў бы прымаць і начаваць турыстаў, павінен атрымаць вялікую грашовую падтрымку. Сёння не ўсім пад сілу адрамантаваць дом, зрабіць у ім прыбіральню і аснасціць так, каб маглі прыязджаць бацькі з дзецьмі. Мая гаспадарка нетыповая, бо я ўкладваю вялікія грошы з маёй варшаўскай фірмы.

— ***А як да Вашай фірмы ставяцца суседзі?***

— Спачатку было зацікаўленне, але калі сталі наведваць экскурсіі, то ў іх паявілася зайздрасць. Наймаў я ў суседкі стадолу — яна адмовіла, а сусед адмовіў далейшай арэнды лугa; таму папрадаваў я тарпанаў, бо не стала пашы. Зараз у кантактах з суседзямі адсутнічае тая сардэчнасць, якая была спачатку. А я ж ім у нічым не перашкаджаю.

— ***Ці разлічвалі Вы на нейкую дапамогу звонку?***

— Спачатку былі свае грошы і такімі пытаннямі я не цікавіўся. Я думаў, што вярнуся з Варшавы да сваіх, праваслаўных беларусаў, а яны будуць мяне падтрымліваць. А пасля стала ўсё наадварот, бо не дапамагалі ні чыноўнікі, ні суседзі. Спачатку паставіліся да мяне вельмі станоўча і самакіраванне, і Польскае турыстычна-краязнаўчае таварыства, але калі паказалася, што я на іншай палітычнай пазіцыі, то ўсе ад мяне адвярнуліся. І шкодзілі! З-за гэтага я страціў два рэстараны: у Музеі і па вуліцы Арміі Краёвай. Была антырэклама і быццам „забарона” наведваць мой рэстаран; за гэта можна было паляцець з працы!

— ***Якое Ваша меркаванне пра агратурызм?***

— Я наглядаю, што цэлы гэты агратурызм з'яўляецца пустазвонствам чыноўнікаў, якія на ім нажываюцца. Бо чыноўнік, які бярэ зарплату за прамоцыю горада ці павета, павінен гэтай прамоцыяй займацца. А за мінулыя дзесяць гадоў ніхто не запрапанаваў мне дапамогі. Наадварот: ні на сайце горада Гайнаўкі, ні на сайце Гайнаўскага павета ніхто не знойдзе маёй „Купалы”, быццам яна зусім не існавала, гэта найбольш сакрэтнае месца на агратурыстычнай карце Падляшша! Я папросту падвергнуты праклёну і не ведаю за што. Нікому не ўчыніў я крыўды, адно толькі хачу быць незалежным. Хачу падкрэсліць, што за дзесяць гадоў маёй тут дзейнасці ніхто не ўчыніў мне столькі крыўды, як г.зв. свае — праваслаўныя.

— ***Аднак „Купала” набірае разгону, не здаяцеся.***

— Мяркую, што ўсё ж такі нешта памяняецца, што гайнаўскія самаўрадавыя чыноўнікі заміж цурацца людзей, будуць іх прыцягваць і заахвочваць да дзейнасці, інвеставання на нашай тэрыторыі. Я раблю сваё: вясною хачу закончыць пабудову вялікага дома, дзе будзе начлежная база і апартаменты, каб захацелі прыязджаць замежныя турысты. Хачу таксама стварыць тут месца і для культуры, для мастакоў, пісьменнікаў. Пазней хачу пабудаваць некалькі драўляных павільёнаў ды сауну. Хачу, каб мая гаспадарка на акраіне Белавежскай пушчы стала найлепшай на Падляшшы.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Міхал Мінцэвіч

Дні Вольнай Беларусі

Фота ПШЭМЫСЛАВА ЯСІНСКАГА

Станіслаў Шушкевіч на спактканні з палітыкамі

6 сакавіка ў Галерэі „Ventzi" адбылося адкрыццё выставы беларускай графікі, якое запачаткавала Дні Вольнай Беларусі, арганізаваныя Беларускім культурна-асветніцкім цэнтрам у Познані.

Выставу адкрыў запрошаны на мерапрыемства былы старшыня Вярхоўнага Савета XII склікання Станіслаў Шушкевіч. На адкрыцці прысутнічалі шматлікія госці, сябры беларускай арганізацыі, а таксама прадстаўнікі мясцовых уладаў. Пасля прамовы гаспадароў галерэі, запрошаных гасцей прывітаў Віталь Воранаў і ўручыў заслужаным сябрам арганізацыі памяткі. Ён прэзентаваў таксама новы лагатып цэнтра — „Ярыла на кані" — запраектаваны беларускім мастаком, які жыве ў Познані, Маркам Максымовічам. У прывітальным слове Станіслаў Шушкевіч выказаў надзею, што ўжо неўзабаве Беларусь стане сапраўды вольнай краінай. Пасля Станіслаў Шушкевіч перарэзаў 25-метровую, бел-чырвона-белую стужку салідарнасці, якую госці ў знак яднання з вольнай Беларуссю прышпілялі да адзежы.

7 сакавіка Станіслаў Шушкевіч меў шэраг сустрэч з высокапастаўленымі палітыкамі. Падчас дыскусіі на тэму будучыні Беларусі

Фота ПШЭМЫСЛАВА ЯСІНСКАГА

Віталь Воранаў

С. Шушкевіч спаткаўся з Маркам Зюлкоўскім — віцэ-маршалкам Сената, прэзідэнтам Познані, рэктарам Вышэйшай школы грамадскіх навук, а таксама з Альдонай Камэлай-Савінскай — былой міністр фінансаў Польшчы. Пазней спадар Шушкевіч быў запрошаны на абед з прадстаўнікамі Права і справядлівасці. Пасля абеду Станіслаў Шушкевіч разам са старшынёй Права і справядлівасці Яраславам Качынскім усклаў кветкі пад помнікам Двух Крыжоў, месцам крывавага разгрому мірнай дэманстрацыі рабочых у 1956 годзе. Вечарам былы старшыня Вярхоўнага Савета прыняў удзел у рабочым спатканні з прадстаўнікамі Грамадзянскай платформы, апазіцыйнай да ўрада партыі. Пасля спаткання Станіслаў Шушкевіч і старшыня Беларускага цэнтра Віталь Воранаў былі гасцямі ў навінах дзяржаўнага тэлебачання.

Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр у Познані

Інтэграцыя па-бандарску

Скрыпучы, 25-градусны мароз не спалохаў арганізатараў мерапрыемства, якое 4 лютага адбылося ў святліцы пажарнага дэпо ў Бандарах. У першую суботу лютага солтыс Бандароў Ніна Лукша і прыхільныя ейнай ініцыятыве культработнікі Гміннага цэнтра культуры і адпачынку (ГЦКіА) у Міхалове, узначаленыя музычным інструктарам Малгажатай Кнот, пастанавілі сарганізаваць бяседу з танцамі для жыхароў бандарскіх блёкаў ды навакольных вёсак і такім чынам узбагаціць культурнае жыццё ў мясцовай святліцы.

Ахвотных прыняць удзел у бяседзе было многа. Войт Міхалоўскай гміны забяспечыў музыкантаў — гурт „Тройка", які існуе пры ГЦКіА. А шостай гадзіне вечара ў прыгожа аздобленую залу сталі прыбываць удзельнікі мерапрыемства, якім мароз не аказаўся страшным. У кухні жанчыны падрыхтавалі смакоцці, у тым ліку і тарты. Ад пачастунку аж сталы ўгіналіся.

Гурт „Тройка" (Марцін Сякерка, Кшыштаф Грыневіч і зорка калектыву Малгажата Кнот) не толькі іграе, але таксама прыгожа свявае. У яго рэпертуары багата беларускіх і ўкраінскіх народных песень у сучаснай аранжыроўцы, якія ў народзе карыстаюцца вялікай папулярнасцю.

Вельмі ўмела ў падрыхтоўцы вечарыны дапамагалі пажарнікі мясцовай каманды. У параднай форме, з шапкамі-рагатыўкамі на галаве дадавалі яны цеплыні і прыгажосці мерапрыемству. З вялікай заангажаванасцю і сардэчнасцю ўключылася ў правядзенне бяседы Ніна Млынэк — загадчыца бібліятэкі на пасёлку Бандары. Яна не толькі выдатна танцуе, але таксама прыгожа спявае і развесяляе публіку.

Удзельнікі культурна-забаўляльнай імпрэзы назвалі яе інтэграцыйнай таму, што прыняла ў ёй удзел моладзь: і гімназічная, і ліцэйская, і старэйшая, і нават „учарайшая", якой нярэдка пад шэсцьдзесят. Усе адчувалі сябе як у адной сям'і — танцавалі, спявалі, частаваліся пірожным.

Пасля некалькіх гадзін танцаў вечарыну наведалі прадстаўнікі гмінных улад: сакратар гміны Станіслаў Мелясінскі, дырэктар ГЦКіА Анна Дабравольская і кіраўнік Жыллёва-камунальнага прадпрыемства Роберт Зялінскі. Яны таксама не прапусцілі нагоды патанцаваць.

Думаю, што калі ў Бандарах ёсць такія актыўныя людзі як Ніна Лукша і Ніна Млынэк ды прыхільныя ім культработнікі ГЦКіА, падтрымка для нізавых ініцыятыў з боку войта Міхалоўскай гміны Марка Назаркі надалей будзе актуальнай.

Віктар Бура

Гісторыя Васількава

Цікавая гісторыя Васількава (Беластоцкі павет). У XIII стагоддзі тутэйшыя землі ўваходзілі ў склад Галіцка-Валынскага княства. Панавалі ў ім сыны князя Рамана Мсціславіча: Даніла і Васілька. Якраз паўночна-ўсходняя частка княства, у тым ліку і землі над ракою Супраслю належала Васільку. Князь Васілька збудаваў над Супраслю ўмацаваную крэпасць, якой даў сваё імя.

Ад той крэпасці да нашых дзён захавалася паблізу горада ні то сярэдневечнае гарадзішча, ні то могільнік тае пары. Па тутэйшай зямлі пракацілася шмат знішчальных войнаў, у тым ліку напады яцвягаў і літоўцаў з поўначы ды татарскія нашэсці з усходу.

У дакументах з 1528 і 1536 гадоў у назве часткі Гродзенскай пушчы выступае „оступ Васільво-во". У 1566 годзе кароль польскі і вялікі князь літоўскі Зыгмунт Аўгуст надаў гораду Васількаву магдэбурскае права. Гербам Васількава ён устанавіў „галаву ласіную". Гэты каштоўны дакумент захаваўся да нашых дзён. Такіх пісьмовых помнікаў на Беласточчыне захавалася некалькі.

Горад Васількаў „пасадаўляў" па загаду Зыгмунта Аўгуста староста Рыгор Валовіч. Ён вызначыў, між іншым, „пляцы на пасадаўленне дамоў у месце". Вядома таксама, што Васількаўскае староства „трымаў" у дзяржаве вядомы гуманіст Лукаш Гурніцкі, недзе да 1603 года.

Сёлета гораду Васількаву спаўняецца 440 гадоў!

(мох)

Міхалоўскія лістаношы

Нядаўна „Кур'ер паранны" апісваў хітрунства беластоцкіх пісьманосцаў, якія нажываюцца на пенсіянерах, не аддаючы ім канцовак ад і так сціплых пенсій. Такім чынам, калі ад кожнага пенсіянера дастанецца ім па 2-3 ці больш злотых, назбіраецца зусім прыстойная сума. Кажуць, з міру па нітцы — голаму рубашка.

Але не ўсе лістаношы так робяць. Прыкладам гэтаму паштальёны з Міхалова, якія, нягледзячы ні на снег ці мароз, ні на адлігу ці завейку, ахвярна і з гонарам нясуць сваю службу. У паштовым аддзяленні ў Міхалове працуе 9 чалавек і ўсе яны свае абавязкі выконваюць выдатна. А дзеецца так дзякуючы начальніцы пошты, якая ўмее працаваць з калектывам і паважае сваіх кліентаў. За гэта кажу ім вялікае дзякуй! Працуйце так далей!

Дзядзька Захар

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 17 -

— Гракі прыляцелі! — выглянула праз акно бабуля. — Цікава, адкуль.

— Чужыя? — Грак таптаўся на падваконніку, паглядаючы на грамадкі чорных з металічным бляскам сваіх пабрацімаў. — З халаднейшага месца ў цяплейшае... нармальная справа, што выбіраецца лепшае.

Сярод знаёмых гракоў, варон ды галак убачыў чужых птушак. Нам здаецца, мабыць, што яны ўсе аднолькавыя, нават варону ад галкі цяжка разлічыць, а папраўдзе кожная птушка — іншая.

— Ты чаго там сапеш на акне? — пацікавілася Гражынка, адклаўшы часопіс.

— Чужыя прыляцелі.

— Ну дык што? Клапоцішся, што есці ўсім не стане? Неўзабаве вясна, сыдзе снег, можна будзе капацца ў зямлі...

— А цяпер? Ты сама расказвала пра аб'яву, каб не падкармляць дзікіх птушак. Якія яны „дзікія", гракі! Ці ж я дзікі?..

— Пералётныя птушкі... Таго... Гэтага. Ты ж сам ведаеш, што хворыя яны...

— Кожны можа захварэць... Прастыць... Праляцела б ты сотні ці тысячы кіламетраў... Да сябе на радзіму... А тут цябе не ўпусцілі б, калі б у цябе пашпарт быў. Баяцца. Хаваюцца. Хатніх птушак знішчаюць...

— Гэта не жарты, Грак. Ты сядзіш у хаце, дык не пераймайся, — бабуля чулліва пагладзіла Грака па пёрах. — Да нас яшчэ птушыны грып не дайшоў.

— А як я магу глядзець спакойна на... крэматорыі!

Бабуля моўчкі патэпала на кухню, шоргаючы тапцямі. Бабуля, калі моцна расстроіцца, снуецца па хаце, а ейныя тапці цягнуцца за ёю як кільватэр.

Гражынка накрыла сваёй каляровую татаву газету, у якую рэдка раней заглядала (тата верыць толькі „Палітыцы"). Каб Грак не ўбачыў. Там напісана, што будуць праводзіцца вучэнні як пазбягаць птушынай хваробы.

Бабуля з кухні вынесла на падворак вялікую місу цёплай кашы для птушак.

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

II і III клас Гімназіі н-р 7 у Беластоку з настаўніцай Алінай Ваўранюк

Пост не прыгнятае мяне

У апошні час усё больш моладзі трымаецца поснай дыеты. Для гэтага часта скарыстоўваюць час Вялікага посту. Пост не заўсёды прыгнятальны і сумны. Ён ачышчае і служыць добрым пераменам. Многія гімназісты заяўляюць аб патрэбе ўшанавання жыцця жывёл і птушак.

На тэму Вялікага посту мы гутарым з беластоцкімі гімназістамі, якія вывучаюць беларускую мову.

Наталля Рудчык: — Вялікі пост гэта час, калі трэба падумаць пра сваё жыццё, направіць усе дрэнныя яго бакі. У гэтым дапамагае мне царква. У пост, больш як у іншыя дні, трэба думаць пра Бога. Паверыць у Яго сілу. Пасціць трэба не адно целам, але і ўсім сэрцам. У посце дапамагае посная ежа. Бываюць дні, якія прысвячаем сваім сябрам, бацькам, навуцы, аднак пост — перш за ўсё — дні для Бога. Пост не прыгнятае мяне, я стараюся выконваць усе патрэбы, аднак не заўсёды мне гэта атрымоўваецца.

Магда Саковіч: — Моладзі цяжка ў пост, мы заўсёды слухаем музыку *на фуль*, аднак у пост трэба гэтага асцерагацца. Трэба трымацца поснай ежы, хадзіць у царкву, не гуляць на дыскатэках, не выседжваць ля камп'ютэра ці бясконца глядзець у тэлевізар. Перад Вялікаднем маем г.зв. *рэкалекцыі*, тады ўсе шчаслівыя, не трэба хадзіць у школу.

Аня Яканюк: — У Вялікі пост я не хаджу на танцы і абяцаю сабе не ласавацца салодкімі батонікамі. Праўда, не заўсёды мне гэта выходзіць. Я абяцаю сабе, што з наступнага года ўвесь час буду спажываць толькі посныя стравы ды ў кожную нядзелю разам з сям'ёй буду хадзіць у царкву.

Оля Максімюк: — Вялікі пост гэта час, калі мы думаем пра сваю сувязь з Богам — так гаворыць настаўнік рэлігіі. А як гаворым мы, вучні гімназіі? Для нас пост гэта проста час, калі мама не купляе мяса, а тата, часцей чым заўсёды, крычыць каб сцішыць музыку. Нельга забывацца і пра *рэкалекцыі*. Гэтыя вольныя ад навукі дні гімназісты лічаць самымі найлепшымі ў час посту. Чаму? Не ведаю. Для мяне пост не ёсць пакутны, таму што я не ем многа мяса і не кайфую ад гучнай музыкі. Гучную музыку я слухаю толькі ў час канцэртаў.

Зорка

Шпак

Сонейка заззяла,
Многа шле цяпла.
Снег растаў наўкола...
К нам вясна прыйшла.

Сёння раніцою
Прыляцеў к нам шпак,
Сеў ён на шпакоўню
І спявае так:

„Выхадзіце, дзеткі,
Сустракаць вясну!
Устала ўжо прырода
З зімовага сну.

На лугу ўжо скора
Кветкі расцвітуць,
А над імі пчолкі
Звонка загудуць!"

Янка Журба

Заклічка вясны

Сонца, зубкі пакажы!
Хай зазвоняць капяжы!
Сонейка, ха-ха, хі-хі!
Скіньце, людзі, кажухі!
Сонейка, рагачы!
Трэба зімцы ўцячы!

Данута Бічэль-Загнетава

Галерэя „Зоркі” (Гайнаўка)

Наталля Каўшук

Фота СЛАВАМІРА ЧЫКВІНА

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні — 5,28.

Мая мянушка — „Жулік”.

У жыцці хачу стаць, чаму — У жыцці хачу стаць паліцыянткай, таму што хачу сачыць за парадкам на дарозе. Я лічу, што мае мары здзейсняцца і я буду працаваць у паліцыі.

У сяброў цаню — шчырасць, добразычлівасць, вернасць, а таксама натуральнасць. Думаю, што кожны чалавек павінен знайсці сабе такіх сяброў, з якімі можа і гуляць, і плакаць. Мая сапраўдная сяброўка — Ева. Мы разам вучымся ў адным класе, разам гуляем на дыскатэках. У мяне вялікае шчасце, што я яе спаткала ў сваім жыцці.

Не люблю — хлусні, несправядлівасці і самаўпэўненых людзей. Найбольш не люблю, калі нехта іграе з пачуццём другога чалавека.

Па-беларуску размаўляю — з сям’ёй, перад усім, з бабуляй і дзядуляй на вёсцы.

Мой любімы гурт — я не маю свайго любімага гурту, таму што я, залежна ад настрою, слухаю розную музыку. Аднак найбольш цаню сабе такія гурты як „Infemal”, „Sylver”, „Groove Coverage”.

Каля свайго дому пасаджу — многа розных кветак, а перад усім, ружу — сімвал кахання.

Міра Лукша

Снегавік

На падворку перад школай
снегавік стаяў вясёлы.
Тоўсты, белы як і трэба,
з носам уверх глядзеў у неба.
А на небе сонца свеціць,
вясну хочуць моцна дзеці.
Цёпла, душна балвану,
пот цячэ з ілба яму,
ну а чорны саганок
з’ехаў з чэрапа набок.
Пахудзець бы — дык лягчэй
будзе... Вось як пот цячэ!..
Пастаяў сярод двара —
раптам знік — прыйшла пара.
Толькі венік і маркоўка
ды саганчык чакаць зноўку
зіму будуць — балван новы
стане ў вопратцы зімовай.

Тры Паўліны і Паўл

— Ведаеш, Паўліна, — выцінуў з сябе Паўл, — я хачу...

— Ведаю, ведаю, — перабіла яго гімназістка. Яна дастала з сумкі сшытак па хіміі і падала сябру ў рукі.

— Я не пра тое, я хачу... — Паўл адчуў, што ў яго гараць шчокі і стала суха ў роце. — Я хачу з табой дамовіцца, ну, разам пайсці ў кіно.

— Ва-ууу! — узвыла ад радасці хіпі і ледзь не пацалавала Паўла ў пунсовую шчочку. Аднак з-за сяброў, што выстойвалі за іхнымі плячыма, Паўліна Ш. адскочыла на некалькі метраў і тэатральна заявіла:

— Ты, вядома, прыйдзеш з Марцінам, а я — з Іголкай?!

Паўл паківаў ёй галавой, хоць адчуў яе ігру і ўзамен падмаргнуў сяброўцы.

— Вядома, вядома! — усклікнуў ён таксама неяк тэатральна ды так, каб усе чулі.

— Вядома! Вядома! — падхапілі сябры. Некаторыя з іх пачалі біць у ладкі, рыхтык героі амерыканскіх фільмаў.

Ніхто з гімназістаў не прыкмеціў, калі ў залу ўвайшоў Леў Катовіч. Настаўнік хіміі не любіў раманаў сярод школьнікаў. — На гэта, — даказваў ён, — будзе час. Пад лозунгам „час” настаўнік разумеў адно — сужонства. Сапраўды, яго ўрокі часта напаміналі заняткі пад загалоўкам „Падрыхтоўка да жыцця ў шчаслівай сямейцы”. Дзяўчына, — дакладваў Катовіч, — раней чым замуж павінна пайсці ва універсітэт. Аднак, не дзеля навукі яна мела закончыць вышэйшую установу, не!

Логіка Катовіча збівала з ног, асабліва дзяўчат, якія лічылі сябе феміністкамі.

— Тады навошта дзяўчыне універсітэт? — цягнулі дзяўчаты настаўніка за язык.

— Як — навошта? — нерваўся той: — А на тое, каб знайсці адпаведнага мужа!

Раманы паміж гімназістамі Леў Катовіч успрымаў як здраду ягонай філасофіі.

І, вядома, сёння на „першы агонь” быў выкліканы да дошкі Паўл, пасля Паўліна Ш. Адзінкі атрымалі таксама Марцін і Іголка, якія адно дзеля жартаў трапілі ў гэту гісторыю. Уся чацвёрка мела распісаць хімічныя ўзоры „хіміі”, якая спрацоўвае паміж закаханымі.

— Хацелі ў кіно, — хіхікаў за сваім сталом Катовіч, — дык маеце кіно! Хі-хі-хі!

(працяг будзе)

Арабінка

Польска-беларуская крыжаванка № 12

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 8: Важак, бяляк, пух, расол, ас, рот, бал, цынамон, апавяданне, рок, гай, збанок. Пацан, вусы, ах, нара, напой, ар, мак, карова, соня, бот, дуб, ял, банан, колье.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі: **Раксана Раманчук, Лукаш Марчук, Адам Харкевіч, Уля Мацкевіч** з Нараўкі, **Кася Сцепанюк, Аня Анікіюк, Мажэна Дзмітрук, Наталля Янцэвіч, Паўліна Башун** з Чыжоў. Віншуем!



Кашалёў не абмінула трагедыя

Жыхары Кашалёў з жахам успамінаюць ваенныя падзеі, якія не абмінулі іх вёскі. Летам 1944 года савецкае войска, абстрэльваючы ў вёсцы немцаў, забіла некалькі яе жыхароў і знішчыла распаложаныя побач сябе будынкі. Пасля нямецкія салдаты, якія адступілі перад савецкай арміяй, сталі лёгкаўзгаральнымі снарадамі страляць па Кашалях. Ад пажару ўцалела толькі дзесятая частка сяла, якое налічвала каля 120 сем'яў. Многа свіней і курэй згарэла ў хлявах або затхнулася ад дыму. Сяляне стараліся схаваць у лесе перад савецкімі салдатамі коней, але не ўсім гэта ўдалося. Коні знойдзеныя рускімі вайскоўцамі пагналі на фронт. Уцалелі толькі каровы, якія пасвіліся на супольнай пашы, далёка за вёскай.

Мікола Пасечнік (сын Сяргея)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Аляксей Чыж

Пацярпелі ад абстрэлу

— Савецкія салдаты, якія гналі немцаў, абстрэльвалі нашу вёску з-пад Рудутаў. Тады загінула некалькі нашых жыхароў і знішчаны былі будынкі. Спачатку немцы адстрэльваліся, а пасля адступіліся на ўзгорак побач Спічкоў і адтуль сталі абстрэльваць рускія войскі. На гэтым узгорку было пад 20 нямецкіх салдат, але бараніліся яны доўга. Галоўная трагедыя здарылася тады, калі немцам прыйшла дапамога. Пад'ехалі яны на танках пад вёску і сталі з лёгкаўзгаральных снарадаў страляць па нашых хатах, клунях і хлявах, — кажа Аляксей Чыж. — Пажар хутка разышоўся на іншыя будынкі і амаль уся вёска згарэла. Ад дамоў асталіся толькі разваленыя печкі і коміны.

Яшчэ перад прыходам савецкіх атрадаў некаторыя сяляне сталі капаць у Кашалях ямкі і прыстасоўваць іх на бамбасховішча.

— Мы за клуняй зрабілі бамбасховішча, але туды стала падыходзіць вада. Пасля мы выкапалі другое сховішча паміж хатай і клуняй і рашыліся перачакаць баявыя дзеянні на сваім панадворку. Калі ад нямецкіх снарадаў сталі гарэць суседскія будынкі, стала вельмі жарка. Мы выйшлі з бамбасховішча і заўважылі, як упаў вогненны клубок і ад яго загарэлася наша клуня. Пасля цяжка было спыніць агонь, каб не дайшоў да хаты. Можна было яшчэ паспрабаваць ламаць плот паміж домам і хлявом. Аднак бацька пабег спыняць агонь у напрамку суседа і ўсё ў нас згарэла, — гаворыць Анна Цэтра. — У час пажару мы паспелі толькі вынесці падушкі. Усе нашы будынкі і маёнтак, што знаходзіўся ў іх, згарэлі. У нашым канцы вёскі ацалела толькі адна хата. Калі мы выкапалі схаваную перад надыходам фронту вопратку, аказалася, што яна прамокла і мы ледзь яе асушылі.

Сям'я Пасечнікаў, пасля прыходу ў вёску савецкіх салдат, выехала да сваякоў у Рудутах. Дома астаўся толькі гаспадар, які сачыў за маёнткам.

— За пажарам мы назіралі з Рудутаў, а бацька ў час абстрэлу вёскі ляжаў у бульбе на агародзе. Бачыў ён як запальвалася наша клуня, але апасаўся яе гасіць, бо стралялі таксама з разрыўных снарадаў. У клуні была кабыла, але для бацькі не ўдалося выратаваць яе ад агню, — тлумачыць Мікола Пасечнік (сын Антона). — Наша хата і гаспадарчыя будынкі аддаленыя былі ад клуні, але загарэліся ад суседскіх будынкаў і згарэлі. Ад плота астаўся толькі адзін дубовы стоўбік. Каля нас усё згарэла, толькі ў другім канцы вёскі ўцалела больш дамоў.

— За вёскай убачылі мы спаленыя машыны з рускімі салдатамі, ад якіх засталіся толькі апаленыя шкілеты. Відаць, уцякалі яны ад немцаў і ў іх трапілі снарадамі, — гаворыць спадарыня Анна.

Адбудоўваліся без дзяржаўнай дапамогі

— Калі немцы адступілі далей, рускія салдаты сталі забіраць коней на ваенныя патрэбы. Але з забранымі коньмі было па-рознаму. Здарылася, што саветы прадалі нашага каня за гарэлку ў Малінніках, — кажа Аляксей Чыж. — Сваіх коней схаваў я ў лесе, у балота, і салдаты туды не дайшлі.

Яшчэ доўга пасля пажару жыхары Кашалёў перажывалі трагічныя здарэнні. Спачатку звярталіся яны за дапамогай да сваякоў з іншых вёсак.

— Дапамогі на адбудову дамоў з боку дзяржаўных улад не было. Нашы людзі памалу адбудоўваліся з дапамогай сямейнікаў, — тлумачыць Аляксей Чыж.

— Пасля пажару абышлі мы ўсё папялішча і рашыліся спачатку начаваць у бамбасховішчы. Пазней з дапамогай прыйшлі нам сваякі з іншай вёскі і памалу мы пачалі адбудоўвацца, — кажа Анна Цэтра. — Дрэва на будову хаты бацька рыхтаваў разам з маімі сёстрамі. Ільняным палатном мы расплачваліся з майстрамі, якія будавалі наш дом. На зіму мы перайшлі жыць у новую хату, але збудаваны з сырога матэрыялу дом пачаў крывіцца. Дрэва пачало пацець і на нас капалі кроплі вады.

Мікола Пасечнік (сын Сяргея) вярнуўся дамоў з бальніцы, калі ўжо аднавяскоўцы адбудоўваліся.

— Калі быў пажар, мяне не было дома. Яшчэ ў час вайны забралі мяне на работу ў Нямеччыну. Пасля адступлення немцаў мне захацелася яшчэ пазмагацца і я рашыўся ўступіць у польскае войска. Калі мяне ў яго не прынялі, я падаўся ў савецкае. Пасля ранення пад Вроцлавам мяне адвезлі ў бальніцу ў Чэнстахову і толькі пасля нейкага часу я вярнуўся дамоў. Брата майго прымусова забралі ў армію, загінуў ён на фронце і таму цяжка было нам адбудоўвацца пасля пажару, — гаворыць Мікола Пасечнік (сын Сяргея).

Каб расплаціцца з майстрамі, сям'і Пасечнікаў прыйшлося прадаць аднаго каня.

— Мы падрыхтавалі матэрыял на будову дома яшчэ да пажару і ляжаў ён у агародзе. Нямецкія танкі, якія стралялі па нашых будынках лёгкаўзгаральнымі снарадамі, падышлі ажно пад вёску. Калі адзін з танкаў загразнуў, пад гусеніцы падкладвалі матэрыял падрыхтаваны на будову нашага дома, што знайшлі на нашым панадворку. Пасля пажару гэты матэрыял прапаў, але астатніх брусоў хапіла на будову хаты, — тлумачыць Мікола Пасечнік (сын Сяргея) і паказвае на свой дом, у якім жыве па сённяшні дзень.

У сям'і Міколы Пасечніка (сына Антона) было 9 асоб, у тым ліку 6 дзяцей. Аднак з-за фінансавых цяжкасцей не рашыліся яны на будову вялікай хаты.

— Спачатку мы жылі ў былой жыдоўскай хаце ў Орлі. Пазней у Вэрстоку купілі клуню і зрабілі з яе невялічкую хатку. Спалі ў ёй, як парасяты, адзін побач другога. Пазней зрабілі ў доме печку і жылі там да 1947 года. Тады перабраліся ў большы драўляны дом, — успамінае Мікола Пасечнік (сын Антона).

Аляксей Мароз

Пра мінулае „Нівы"

Чытаючы тэкст „Разбудзілі беларуса" аўтарства Аляксандра Вярбіцкага („Ніва" н-р 11 ад 12 сакавіка 2006 г.) не пазбягаю магчымасці вярнуцца да гэтых падзей, аб якіх расказвае Вера Валкавыцкая. „Недзе з 1970 года пераняла я карэспандэнтаў (...). Бывала тады так, што звыш палова зместу „Нівы" складалася з карэспандэнцый! Крытычныя тэксты (...) мы пасылалі ў крытыкаваныя ўстановы (...). На крытыку нам адказвалі".

Перыяд шасцідзесятых-васьмідзесятых гадоў я лічу самым плённым у карэспандэнцкай дзейнасці. Змаганне ў конкурсе „Карэспандэнт года", сустрэчы на з'ездах, выклікаюць у маёй свядомасці самыя мілыя ўспаміны. Колькі тады налічвала сям'я карэспандэнтаў? Паўсотні, як не больш! Пісалі школьнікі, настаўнікі, працаўнікі дзяржаўных устаноў ды земляробы з адлеглых мясцін Беласточчыны. Да актыўных карэспандэнтаў належалі: Мікалай Панфілюк з Дубіч-Царкоўных, Уладзімір Хомік са Слоі, Аляксандр Закройшчык з Нараўкі, Мікалай Няплоха з Бельска-Падляшскага, Вольга Пракапюк з Градалёў, Пётр Байко з Белавежы, Мікалай Лук'янюк з Бялкоў, Эдмунд Вайсковіч і Віктар Бура з Гайнаўкі ды многа іншых. Большасць маіх тэкстаў гэта крытычныя карэспандэнцыі. Па сённяшні дзень захаваліся выразкі адказаў на крытыку. Не прапускаў я хібаў, паталагічных з'яў штодзённага жыцця. Выказваў гэта ў рубрыках „Кажуць, што...", „Якія мы людзі", „З маёй званіцы" і ў „Казках для дарослых". Не ўсе тэксты захаваліся ў хатнім архіве. Каб скласці іх у адну цэласць, дык атрымалася б шматтомная кніжка. Пачаткова тэксты падпісваў я кліччкай „Мацейка", крытычныя — „Актус". Затым ініцыяламі (ус) і звычайна, прозвішчам. Для многіх знаёмых я надалей „Мацейка". І цешуся, што людзі так запамяталі мяне. Варта адзначыць, што для многіх людзей у чаромхаўскім асяроддзі ды ў крузе чыгуначных начальнікаў — установы, дзе я працаваў да пенсійнага ўзросту — застаўся „закалай" ды „паршывай авечкай". Я аднак не траціў ахвоты і не пахіснуўся ў сваёй стойкасці ісці дарогай праўды.

У маім хатнім архіве захаваліся не толькі даўнейшыя тэксты, якія друкавала „Ніва", але і здымкі са з'ездаў ды верш Дзядзькі Кваса, які друкаваўся ў „Ніве" н-р 10 ад 5 сакавіка 1978 года „Замест слова ў дыскусіі на з'ездзе карэспандэнтаў «Нівы», у якім зрабіў падлік дзейнасці ды ацэнку карэспандэнтаў:

Усяму наперакор
Я аб вас сябры-селькор.
Ці вы рады, ці не рады,
Выкажу свае пагляды.

І далей:

Панфілюк? Не здзівіць вас,
Што шрайбуе ў поўны газ.
Як прыкладны беларус,
Йдзе ўпярод таранам Ус.
Без устрымання нінатроха
Піша, аж скрыпіць Няплоха.

Асабіста я не быў знаёмы з пачотным аўтарам тэксту. Аднак, чытаючы Яго вершы ў „Парнасіку", адчувалася любоў да чалавека, да роднага слова.

У шматгадовай карэспандэнцкай дзейнасці быў час, калі ставаў я на раздарожжы — пісаць ці не пісаць у „Ніву"? Некаторыя калегі прапанавалі мне пачаць супрацоўніцтва з польскамоўнай газетай. Я аднак застаўся пры „Ніве". Тут ставіў першыя крокі ў вывучанні роднай мовы, тут застануся да апошніх сваіх дзён, пакуль здароўе дазволіць. А тэмы для допісаў можна знайсці, абы воля была такая.

Уладзімір Сідарук

Новае жыццё Вішанькі і Ёжыка

Ёжыка ўбачылі чытачы „Нівы" ў 1956 годзе, у адным з першых нумароў „Нівы". Ехаў на матацыкле рэдактар Ян Рыбінскі, разведваючы глыбінку, і за паваротам, праз гул свае шалеючай на міхалоўскіх пяшчыстых дарогах машыне пачуў ігранне гармоніка. На лузе на вялікім камені сядзеў худзенькі пастушок і ціснуў мяхі гузікавай гармошкі на 12 басоў.

Закрунуў рэдактар сваім маторам, аж дзярно паляцела, прытармазіў перад хлопцам у парцяных пацёпканых знізу нагавічках, а той нічога — заплюшчыўшы салодка вочы — далей „тальяначку" са старэнькага гармоніка выцягвае. Той гармонік дастаўся быў Ёжыку цяжка — тата аддаў грошы за карову за парэпаныя мяхі і расклекатаныя гузікі, бо чуў — Ёжык мае талент і нічога больш не хоча, каб толькі іграць. Нявучаны, а сам так умее — што толькі раз учуе, усё зайграе-паўторыць. І, як шалёны — не будзе есці і піці, а іграў бы дзень і ноч, як дыхаў бы. І так усё жыццё.

Пайшлі мы следам Ёжыка. Цікава было, што з першымі героямі ніўскіх вандраванняў старых рэдактараў, якіх часам няма ўжо ў жывых. І героі пайшлі па-рознаму. Аднаму хлопцу бліжэй было зрабіць круг, пабадзяўшыся па свеце, згубіўшы тое што меў найлепшае, і толькі пачка зношанага адзення вярнулася ў родную вёску, іншы, кляймаваны малалеткам за хуліганства з прозвішча, пайшоў у дырэктары... А Ёжык далёка не пайшоў, хоць ад таго часу разоў сем ці восем мяняў прыстанішча. Адно ўсюды валок свае гармонікі, сам ужо моцна кульгавы (нагу меў пакручаную ад маленства), ды прытанцоўваючы. Гармонікі мяняліся, ды пешчаныя былі Ёжыкавай далонню як родныя.

Ёжык доўга затрымаўся быў у Гарадоцкай гміне. Пайшоў у прымы ў Меляшкі. Завёў там сям'ю, разам з жонкай гадаваў шасцёра дзяцей, гаспадарыў. Дваццаць сем гадоў працаваў і іграў, таксама і ў драмгуртку меляшкоўскіх кабет, якія нават і ролі мужыкоў іграліі. Ёжыку дасталася роля... чараўніцы. „Ой, умеў ён прадстаўляць!" — дагэтуль смяюцца меляшкоўскія жанчыны. Прыехаў „прадставіць" на спецыяльнае запрашэнне на сямідзесяцігоддзе Фані Бароды. Зайграў так, што людзі аж плакалі ад радасці. Гэта не танцы ды спевы пад фанаграму!.. Найбольш уцешылася Фаня. Фані Бароды ўжо няма ў жывых — гэта яе можна цяпер убачыць на здымку Паўла Гжэся ў труне на меляшкоўскай вуліцы, сярод іншых, жывых яшчэ вяскоўцаў. Адно ўспамін па людзях застаецца... І Ёжык у Меляшкі больш не прыязджае, у хату былое жонкі, што ад Фанінай праз дзве. І жонка ягоная першая зрэдку сюды заглядае. А дзеці рассыпаліся па свеце. Няма хаты, бо няма людзей, хоць стаіць пасярод вёскі адноўленая і прыгожая. Пустая. Бо выгнала Ёжыка з заседжанага і мілага месца... каханне.

Ёжык доўга затрымаўся быў у Гарадоцкай гміне. Пайшоў у прымы ў Меляшкі. Завёў там сям'ю, разам з жонкай гадаваў шасцёра дзяцей, гаспадарыў. Дваццаць сем гадоў працаваў і іграў, таксама і ў драмгуртку меляшкоўскіх кабет, якія нават і ролі мужыкоў іграліі. Ёжыку дасталася роля... чараўніцы...

Праз больш за чвэрць стагоддзя Ёжык у „Ніву" прыйшоў быў разам з каханай Вішанькай. Зайшоў у пакой, дзе прымаў чытачоў тыднёвіка Вінцук Склубоўскі, ніўскі карэспандэнт і юрыст. Трэба ім была юрыдычная парада — усе ведалі, што ў рэдакцыі дае дармовыя парады былы суддзя. Але Ёжык перш за ўсё хацеў пагаварыць пра каханне. Закахаліся, вось, абое, ён ды Вішанька з суседняе вёскі. Каханне прыйшло ў сталыя гады. Кінуў Ёжык сваю добрую сям'ю, кінула і Вішанька свайго благога мужа, што біў яе ды крыўдзіў і не шанаваў, хворую падучай хваробай — эпілепсіяй. Дык, вось, зацяжарыла. Мабыць, Ёжыкава дзіцё гэта, а, можа, і мужава яшчэ, бо з ім 20 год жыла. Разводу не маюць, дык ці той патомак можа па шлюбным бацьку спадчыну мець? Каб ніхто прэтэнзіі не меў, калі што. Стары юрыст крыху быццам разгубіўся, парады першы раз сумленна не даў. Дарэчы, той зачаты патомак не стаў праблемай. Дзіцятка памерла. А Ёжык з Вішанькай паехалі ў свет. Пакуль не былі разам, пісалі лісты адно аднаму — паказваюць мне іх цяпер як найбольшы скарб. Быццам ім не па больш як па паўстагоддзя было, а па шаснаццаць гадочкаў. Цяпер яны жывуць у Нарве, у хаце Вішаньчынай маткі нябожчыцы. Не хацела іх раней прыняць, лічыла іх сувязь грэшнай ды зусім бесталковай. Чаго было кідаць Вішаньцы мужа, які не быў горшы ад іншых, вялікую харошую гаспадарку, адбіраць бацьку сям'і, і бадзяцца па чужых хатах? Ды і той Ёжык — ні красы, ні фігуры, страўнік дзіравы, ногі кульгавыя, ні прафесіі талковай, адно толькі што іграць умее! А пакуль трапілі Ёжык з каханай, дык семнаццаць гадоў па Беласточчыне хаты наймалі. Былі і ў Тыневічах, былі і ў Курашаве... Усюды цяжка. Ды разам. Цяпер хоць шлюбныя.

Цяжка ім і цяпер. Хату трэба было адрамантаваць. А хто дасць на гэта? Бо ж самі не маюць грошай. Пісаць трэба прашэнне ў гміну, у гмінную апеку. Вокны ўставіць, печ паставіць новую, белымі плітамі абіць столь, абклеіць сцены... Каханнем адным не выжывеш, вядома.

Міра Лукша

На галодным пайку

У 1943 годзе вызначылі мяне на прымусовыя працы ў Нямеччыну, бо бралі ўсіх тых, што нарадзіліся ў 1925 годзе. Вялі нас з Турны на зборны пункт у Сямятычы. З тае калоны сталі ўцякаць. Ну і я таксама, калі калона паварочвала, збегла за вугал вуліцы і вярнулася дахаты. Тады бацькі адправілі мяне да сваякоў у Радзівілаўку. Пасля, бадай, двух тыдняў прыехалі немцы ў нашу хату, забралі ў сямятыцкі арышт маму і сказалі, што звольняць яе тады, калі з'яўлюся я.

Даведалася я пра гэта і падалася дахаты. Нічога не хацелася мне тады есці, схапіла толькі нейкую вопратку і тата завёз мяне ў Сямятычы. Мяне забралі, а маму звольнілі. Назбіраўшы транспарт немцы завезлі нас на самаходах у Бельск. Там, здаецца, нядоўга нас трымалі. Я з сяброўкай выйшлі на горад; яна была прыгожая і вартаўнік нас выпусціў. Пасля, калі мы вярнуліся, ён вельмі дзіваваўся нашаму вяртанню.

У Бельску пасадзілі нас на поезд і завезлі ва Усходнюю Прусію. Працавалі там у маёнтку на полі, збіралі з палёў бульбу і гародніну. Кармілі нас пагана: усё вараную неабчышчаную адну бульбіну і да яе маслёнку. Мы гэта спачатку вылівалі, але калі голад прыціснуў, папрасілі польскіх кухарак, каб нам далі нешта іншае. Яны сказалі, што самі яны нам нічога змяніць не могуць, але параілі, каб мы тае ежы не выкідалі, але вярталі назад у сталовую. Гэта памагло, сталі нас карміць лепш.

Пад зіму забралі нас з Прусіі і перавезлі ў Вестфалію. Паставілі нас на працу ў фабрыку амуніцыі. Кармілі нас галодным пайком, абы мы не паўміралі. Кавалак хлеба, таўшчынёю ў два пальцы, які давалі нам на цэлыя суткі, мы з'ядалі адразу пасля атрымання ў рукі. Аднойчы я з дзвюма сяброўкамі адправілася па навакольных вёсках прасіць есці. Прайшлі мо з дзесяць кіламетраў, але ніхто не даў нам ні крупінкі. Наш завод часта бамбілі і пасля адной такой бамбёжкі перавялі нас у іншую фабрыку.

Вызвалілі нас амерыканцы. Перавялі нас з баракаў, у якіх мы жылі, у апусцелыя казармы. Далі нам па банцы сасісак і калі мы іх з'елі, то ледзь не паўміралі: нашы страўнікі не справіліся з такой непрывычнай ужо ім колькасцю ежы; пасля ўсё з харчаваннем выправілася. Неўзабаве амерыканцаў падмянілі англічане, але яны кармілі нас горш.

Недзе летам перавезлі нас да саветаў. А яны заміж накарміць нас, усё гаварылі, які ў іх дабрабыт. Праз нейкі час вызвалілі нас і я з сяброўкай прыехала ў Познань. Там на вакзале прадаўшчыца булачкі прадае, мне есці хочацца, а няма за што іх купіць. Каб такое сёння было, дык я папрасіла б, што я з няволі вяртаюся, каб яна дала мне хаця адну. А тады я такая запужаная была, баялася прасіць і толькі слінку каўтала.

Заехала я з сяброўкай у Брэст, бо думала, што Сямятычы асталіся ў Савецкім Саюзе. Нехта параіў ехаць у Чаромху, а калі ў Высокім загадаюць высаджвацца, астацца ў поездзе. Так мы і зрабілі.

У Чаромсе адзін чыгуначнік сказаў, што едуць эшалоны ў Седльцы, але на станцыі ў Сямятычах не спыняюцца; параіў нам дамовіцца з машыністам. Мы дамовіліся, ён абяцаў, што звольніць ход, каб мы маглі выскачыць з поезда. Поезд нам запаволіў, мы выскачылі, а памочнік машыніста не хоча нам скінуць нашых чамаданчыкаў. Я крыкнула, што апрача дакументаў і старой вопраткі нічога ў іх няма; ну і ён скінуў іх.

У Турне першай пабачыла мяне суседка, доўга мне прыглядалася, але пазнала. Зайшла я дахаты, кінулася тату на шыю. Пасля прыйшла мама... Яны быццам і не спадзяваліся ўжо, што я вярнуся.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

(Аўтарка ўспамінаў папрасіла захаваць яе ананімнасць.)

Пры жаданні здабыць патрэбную інфармацыю ў розных галінах навукі цяпер не так цяжка, як гэта было яшчэ дзесяць гадоў таму...

http://eurouniver.info

Альтэрнатыўныя формы атрымання ведаў і нават адукацыі ўсё больш упэўнена ўваходзяць у наша жыццё. Пры жаданні здабыць патрэбную інфармацыю ў розных галінах навукі цяпер не так цяжка, як гэта было яшчэ дзесяць гадоў таму. Сёння ў Беларусі атрыманне прафесійнай адукацыі часцяком звязанае з рэаліямі ўплыву дыктатуры на адукацыйны працэс. З-за гэтага бывае, што самі веды становяцца чымсьці другасным у параўнанні з ідэалагічнай лаяльнасцю, якая ў цяперашні час насаджаецца ў галовах студэнтаў. Таму доступ да якаснай інфармацыі без ідэалагічнага шалупіння сам па сабе становіцца вялікай каштоўнасцю. Магчымым такі доступ становіцца дзякуючы Інтэрнэту.

Не так даўно ў Байнэце распачаў сваю працу сайт пад назвай „EuroUniver". Месціцца ён па адрасе http://eurouniver.info. Першая старонка змяшчае, стаўшыя ўжо сімвалічнымі, формы і колеры Еўрасаюза — зоркі на блакітным фоне. Крыху ніжэй назва сайта і, з правага боку, навінныя паведамленні. Яны тычацца, як і мае быць, навінаў данага праекта і больш падобныя на абвесткі аб розных вучэбных прапановах.

Непасрэдна аб сайце распавядаецца на старонцы „Праект", якая ёсць свайго роду неблагой яго прэзентацыяй. „Адкрыты асветніцкі праект «EuroUniver» — гэта віртуальны універсітэт, аб'яднанне выкладчыкаў і студэнтаў, асноўным сродкам якога з'яўляецца нефармальная адукацыя, — пішуць стваральнікі сайта. — Асветніцкая дзейнасць праекта «EuroUniver» скіравана, па аналогіі з найлепшымі беларускімі цэнтрамі класічных еўрапейскіх ведаў, на развіццё інтэлектуальнай незалежнасці і крытычнага мыслення чалавека, як найважнейшых умоў умацавання грамадзянскай супольнасці і фармавання еўрапейскай свядомасці". Такім чынам бачна, што данесці веды навучэнцам без прымесяў ідэалагічнае атруты з'яўляецца галоўнай мэтай праекта. Дарэчы, стваральнікамі сайта сталі беларускія і польскія грамадскія арганізацыі — віцебскі „Верас" і гданьская „Wiedza Powszechna".

Найбольш карыснымі, а з таго і цікавейшымі, ёсць тыя рубрыкі „EuroUniver", што распавядаюць якім чынам і па якіх дысцыплінах можна набыць веды па цікавячых студэнта напрамках. Формы навучання могуць быць як праз электронную пошту, так і па карэспандэнцыі, а таксама праз звычайнае наведванне лекцый і семінараў асабіста. Праўда, апошняя форма больш арыентавана на жыхароў Віцебска.

Рубрыка „Студыі і курсы" падае інфармацыю, якія дысцыпліны могуць быць даступныя студэнтам, зарэгістраваным на сайце. Гэта студыі еўрапеістыкі, сацыяльна-палітычных накірункаў, камунікацыйных тэхналогій, культуразнаўства і замежных моў. Кожная студыя змяшчае шэраг дысцыплін, якія можа выбраць для сябе студэнт. На жаль, не ўсе яны магчымыя для е-студэнтаў, але, як абяцаюць распрацоўшчыкі, колькасць даступных праз Інтэрнэт дысцыплін будзе пашырацца.

Пра даны сайт можна распавядаць многа, аналізуючы ўсе яго бакі. Але, падаецца, зацікаўлены ў набыцці ведаў чалавек пажадае самастойна пазнаёміцца з магчымасцямі гэтага праекта, і, усё можа быць, стане студэнтам „EuroUniver". Дарэчы, для такіх на сайце створана адмысловая электронная бібліятэка, дзе навучэнец здабудзе для сябе неабходную для вучобы інфармацыю.

Уладзімір Лапцэвіч

Крыху сенсацыйна залаты медаль з вынікам 19 м 84 см заваявала беларуская штурхальніца ядра Наталля Харанека...

Беларусь, беларусы...

Каштоўнае ядро

Цэнтральнай спартовай падзеяй мінулага тыдня стаў чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы ў залах, што прайшоў у Маскве. Значнасць мінімпершынства планеты не такая вялікая як форумы на адкрытых стадыёнах. Але паспяховы выступ на ім істотна падвышае прэстыж як асобных атлетаў, так і краін, якія яны прадстаўляюць. На ўсіх апошніх чэмпіянатах беларускія лёгкаатлеты выступаюць досыць удала. На лісабонскім першынстве 2001 года вызначыліся толькі жанчыны — чэмпіёнкай стала пяціборка Наталля Сазановіч, сярэбранай прызёркай — штурхальніца ядра Надзея Астапчук, бронзавай — спрынтэрка Наталля Сафроннікава (бег на 200 м). У 2003 годзе на спаборніцтвах, што праходзілі ў англійскім Бірмінгеме, зноў вызначылася трыо нашых удзельнікаў: Астапчук пацвердзіла свой ровень і стала другой, Сазановіч тады задаволілася віцэ-тытулам, а бронзу ўзяў скакун у вышыню Генадзь Мароз. У апошняга гэта быў лепшы вынік у кар'еры. Будапешт-2004 таксама стаў станоўча выніковым. Цікава, што на гэты раз усе тры ўзнагароды былі заваяваныя ў спрынце. У эстафеце 4 па 100 м беларускі (сёстры Святлана і Ілона Усовіч, Ганна Козак і Наталля Салагуб) здабылі сярэбраны камплект. Юлія Несцярэнка, пра якую тады яшчэ мала хто ведаў, была трэцяй па бегу на 60-метровай дыстанцыі, а Наталля Сафроннікава пасля дыскваліфікацыі за допінг расійскай бягунні была аб'яўлена чэмпіёнкай на сваёй улюбёнай 200-метровай дыстанцыі.

На гэты раз у складзе беларускай дружыны было 12 лёгкаатлетаў, якія прадстаўлялі 6 розных дысцыплінаў. Крыху сенсацыйна залаты медаль з вынікам 19 м 84 см заваявала беларуская штурхальніца ядра **Наталля Харанека**, хоць галоўнай фаварыткай спабору лічылася іншая наша прадстаўніца — „стадыённая" чэмпіёнка свету Астапчук. У Харанекі ж, якая летась стала чэмпіёнкай універсіяды, а на першынстве свету была восьмай, гэта вышэйшае дасягненне ў біяграфіі. Ядро ўжо па традыцыі стала для беларусаў найбольш „каштоўным" снарадам. Выхаванец бабруйскай школы **Андрэй Міхневіч** спыніўся на другой пазіцыі, прапусціўшы наперад толькі амерыканскага асілка. „Сярэбраны" штуршок Міхневіча на 21 м 37 см стаў другім па далёкасці ў яго кар'еры. Лепшы вынік быў толькі на „вялікім" чэмпіянаце свету ў 2003 годзе, калі Андрэй стаў галоўным лаўрэатам.

Колькі айчынных прадстаўнікоў не здолелі прайсці кваліфікацыю. Такі лёс напаткаў маладога спрынтэра Максіма Лыншу, Алену Неўмяржыцкую на такой жа дыстанцыі 60 м, Наталлю Сафронаву ў трайным скачку. А вось жаночая эстафета 4 па 400 м парадавала. Наша каманда, за якую былі заяўлены **Ілона Усовіч, Юліяна Жаўнярук, Ганна Козак, Наталля Салагуб, Ірына Хлюстова**, дасягнула трэцяга месца, усяго толькі дзве сотыя секунды саступіўшы амерыканкам.

Лёгкаатлетычны сезон набірае разгон. Праз тыдзень у Тэль-Авіве адбудзецца зімовы чэмпіянат Еўропы па кідальных відах. Беларусь там будзе прадстаўлена даволі салідным складам — удзел у першынстве кантынента возьме тузін нашых лёгкаатлетаў.

Уладзімір Хільмановіч

Бліжэй да народу

— Дык вось што я табе скажу, сябра, — сумным голасам пачаў Лявон, нагбом асушыўшы кілішак „Беленькай" і нават не дакрануўшыся да закускі. — Нашы метады агітацыі — марны лямант. Людзі нас не чуюць. Я ў роспачы. Не ведаю што рабіць. Можа не тое мы ім даводзім? Можа грамчэй трэба крычаць?

— Крычы ім хоць у самае вуха — не пачуюць. Яны панараджаліся глухімі, — зрабіўшы заклапочаны і злёгку дзелавы, як у практыка-псіхолага твар, заявіў Міхась, у дакладнасці паўтарыўшы рухі Лявона, скіраваныя на паглынанне „Беленькай". — Колькі ўжо гадоў апазіцыя дзяўбе адно і тое ж, а мала хто пачуў. Тут патрэбны іншыя метады.

— Цікава якія? — вылупіўся Лявон, уляпіўшыся вачамі ў суразмоўцу як гадзюка на мышаня. — Я ўжо тыдзень чакаю арышту. Сам ведаеш за што. Мае дзеянні даўно сядзяць у пячонках улады. Муляюць ім, як каменьчык у боце. Сёння сваёй жонцы, якая ўжо дзесяць год непасрэдна назірае чым я займаюся, сказаў, што як не вярнуся вечарам дахаты, то значыць мяне забралі. А яна мне ў адказ: „А каму ты патрэбны, каб цябе забіраць. Хіба збіраешся піць гарэлку са сваімі бесталковымі сябрамі-апазіцыянерамі, а мне пляцеш усялякія казкі-небыліцы". Вось і атрымліваецца, што нават самыя блізкія людзі не разумеюць што ў нас робіцца. А як гэта давесці да астатніх? Разбалелася ў мяне душа, пасля жончыных слоў. Кажа, гарэлку піць буду. Ну то буду. Хоць неяк той боль душы заліць.

— А я думаю, што трэба быць бліжэй да народу, — падняўшы палец левай рукі ўгару, а правай паднёсшы чарговы кілішак да вуснаў, глыбокадумна, нібы сапраўдны прафесар-філосаф, заўважыў Міхась. — Далёкія мы ад людзей. Вось паглядзі. Людзі ў гэтай кнайпе гэтак жа як і мы п'юць гарэлку „Беленькую", каму колькі здароўе дазваляе, але не пра праблемы размаўляюць, а весяляцца так, нібы гэта апошняя п'янка ў іх жыцці. Адрываюцца на ўсю шпулю. Ажно шубы заварочваюцца. Караоке для іх уключылі. Яны спяваюць, цешацца жыццём. Цэлая кнайпа, знаёмыя і незнаёмыя, як адно цэлае. Толькі мы з табой тут чужародныя элементы. Сядзім, нудзім. Чаго тады прыйшлі. Паспрабуй паспяваць з імі. Можа тады і мы іх лепей зразумеем, і яны нас.

Лявон падняў вочы. Вакол, з чырвонымі ад колькасці выпітага тварамі, весяліліся людзі. На запыленым і падрапаным экране „Караоке", якому, каб канчаткова падкрэсліць сваю прымітыўнасць і нягоднасць толькі не хапала надпісу „Зроблена ў Кітаі", праляталі словы ненавісных Лявону расійска-папсовых песень. Але іншыя прысутныя са шчаслівымі, як у абкурыўшыхся каноплямі анархістаў тварамі, галасілі кожны ў тры гарлякі, то апярэджваючы мелодыю, то спазняючыся за музыкай.

— Зараз я ім зраблю камедыю. Толькі сумняваюся, што яна нас зблізіць, — злосна вымавіў Лявон, замахнуў яшчэ кілішак, уклініўся ў спяваюча-рагочачую кампанію „караокнікаў", і, не звяртаючы ўвагі на тое, што на экране, пад адпаведную музыку прабягалі словы „Муси-пуси, муси-пуси, милый мой...", зароў хрыплым басам: „А я лягу прылягу, край гасцінца старога..." Зароў так, што на століках паперавaрочваліся кілішкі.

На яго здзіўленне, астатнім гарлапанам такая аранжыроўка расійскай папсы прыйшлася вельмі даспадобы і як на экране паляцелі словы чарговай песні „Нас не догонят...", уся кнайпа зараўла ў адзін голас: „Касіў Ясь канюшыну...".

Здавалася, гэтай забаве не будзе канца. Кожны хацеў выпіць брудэршафт менавіта з Лявонам ці Міхасём і абавязкова пагарланіць каля іх штосьці падобнае на „Кладачка тоненька, вада халодненька, а я малодзенька...". Ды неўзабаве абедзве стрэлкі гадзінніка спыніліся на лічбе 12, што азначала закрыццё кнайпы. Гаспадыня толькі разявіла рот, каб абвясціць пра гэта п'яным наведвальнікам кнайпы (а іншых папросту не было), як адзін з кліентаў перабіў яе:

— Прапаноўваю выпіць за нашых апазіцыянераў, — падняўшы кілішак, звярнуўся ён да ўсіх прысутных. — Я раней і не ведаў, якія гэта цудоўныя людзі. Толькі сёння зразумеў. За вас хлопцы! За БНФ. Жыве Беларусь!

— Жыве! За вас, хлопцы! — хорам падхапіла ўся кнайпа. — І хай гаспадыня паставіць на караоке штосьці беларускае.

— Няма ў мяне нічога такога, — збянтэжылася гаспадыня, а пасля махнула рукой, уключыла першую папаўшуюся музыку і добра пастаўленым голасам зацягнула сама: „Ой ляцелі гусі з броду..."

Генрых Западашмянскі

Падзеленая гміна Нарва

У 7 н-ры „Нівы” за г.г. быў змешчаны артыкул (ам-з) „Застаўся жыць на вёсцы”. Я вельмі ўважліва прачытаў тэкст і вырашыў адгукнуцца, бо згаданыя ў ім справы мне вельмі добра вядомыя.

Па-першае, праўда гэта, што жыхары Ласінкі былі крышачку зацікаўлены каналізацыяй, але старшыня Рады гміны ў Нарве Яўген Дудзіч ані разу не ўспомніў пра Сцяпана Кучынскага, лекара вясковага асяродка здароўя, які ў той час быў старшынёй Рады гміны ў Нарве, а войтам — Ян Тапалянскі. Я ў той час быў гмінным радным і добра ведаю, што калі б не стараннi спадара Кучынскага, то Ласінка па сённяшні дзень не мела б каналізацыі. Колькі тады Сцяпан Кучынскі нахадзіўся, абіваў парогі ў розных установах, каб здабыць грошы з-па-за гміннага бюджэту і гэта яму ўдалося. Таксама і войт Ян Тапалянскі шмат дапамог. А цяпер Яўген Дудзіч быццам пра ўсё забыўся, хоць працаваў настаўнікам у ласінскай школе.

Другая справа. Вёска Ласінка распаложана збоку шашы Гайнаўка — Нарва і ад усходняга боку вёскі добрая дарога да шашы і на аўтобусны прыпынак, адкуль паварочвае аўтобус, што курсіруе праз Ласінку і Трывежу ў Гайнаўку. Там нядаўна на дарозе паклалі асфальтнае палатно. Паклалі таксама асфальт на дарозе Ласінка — Гарадзіска, хаця па ёй не ездзяць аўтобусы ПКС, але гэтая вёска блізка Ласінкі, а спадар Дудзіч з’яўляецца яе жыхарам. Цяпер ён, як старшыня Рады гміны ў Нарве, хоча з гміннага бюджэту паклаці асфальт на павятовай дарозе з Ласінкі праз Кутавую — Храбустоўку да шашы, каб яму лепей было даязджаць на працу ў нарваўскую школу, бо жыве ён пры заходнім канцы Ласінкі. Тут аказваецца, што Я. Дудзіч вельмі хутка пра ўсё забывае, хто найбольш стараўся для Ласінкі. Калі ліквідавалі вясковы асяродак здароўя ў Ласінцы і Сцяпан Кучынскі перайшоў на працу ў Гмінны асяродак здароўя ў Нарве, то і ласінчане забыліся, што ён рабіў для іхнай вёскі.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

У Нарваўскай гміне найгорш пакрыўджаная паўночная частка, г.зн. вёскі распаложаныя на правым беразе ракі Нарвы. Калі ў папярэднім скліканні старшынёю Гміннай рады быў Мікалай Кандрацюк, дык было яшчэ сяк-так. Цяпер, калі я пацікавіўся ў некалькіх солтысаў працай гмінных радных, то ў адказ пачуў, што М. Кандрацюк, калі быў на сесіі Рады гміны, то ціхенька пасядзіць, возьме дыету і едзе дахаты. Другі радны, Ежы Сакоўскі, ляснічы з Трасцянкі, калі быў выбраны ад СЛД, то крышку быў стараўся аб сваіх выбаршчыках, а цяпер памяняў свае погляды і перайшоў у апазіцыю супраць войта. Таксама, як казалі мне солтысы, ціхенька пасядзіць на сесіі абы ўзяць дыету. Цяпер найлепш дзейнічае радная Пагажэльская з вёскі Адрынкі. Яна дабіваецца ў павеце, каб як найхутчэй паклалі асфальт ад шашы ў вёску і гэтага яна напэўна даб’ецца. Калі няма каму раўнамерна старацца пра цэлую гміну, а толькі пра свой „куточак”, дык ніколі не будзе добра. Я ўжо некалькі разоў пісаў у „Ніве” пра дарогу Трасцянка — Бялкі — Агароднікі — Іванкі-Рагазы і яшчэ раз хачу ўспомніць, што солтысы вышэйзгаданых вёсак маюць свае легкавушкі і ім аўтобус ПКС не надта патрэбны. Так што ні солтысы, ні райцы пра гэта не дбаюць. Хачу ўспомніць, што яшчэ пры камуне паклалі асфальт ад шашы праз вёску Рагазы-Іванкі і стрымалі работу. Ужо мінулі тры гады як распачалі асфальтаваць дарогу з Трасцянкі ў Бялкі (каля 4 кіламетраў) і яшчэ не закончылі работы, а гэта ж павятовая дарога, па якой калісьці ездзіла шмат аўтобусаў. Цяпер, на жаль, абмяжоўваюць курсіраванне, як сцвярджаюць улады прадпрыемства ПКС, з-за дрэннай дарогі. Я звяртаюся да старшыні Рады гміны ў Нарве Яўгена Дудзіча з гарачай просьбай — не пхайце грошай з гміннага бюджэту вакол сваёй роднай вёскі Ласінкі. Падумайце таксама пра іншых людзей пражываючых у Нарваўскай гміне. Сёлета адбудуцца самаўрадавыя выбары і трэба ва ўсёй гміне штосьці карыснага зрабіць. Падумайце аб жыхарах Бялкоў, Сакоў, Агароднікаў, Іванкоў-Рагазоў, якія ў час летніх канікулаў не могуць дабрацца на працягу дня ў Беласток, бо аўтобус з Нарвы ў Беласток а гадз. 6.40 курсіруе толькі ў дні школьнай навукі, а на час летніх канікулаў яго адмяняюць. У пасляабедзенны час ужо цяпер няма на чым вярнуцца дамоў з Беластока. Гэтая справа вядомая праўленню гміны на чале з войтам Якубам Садоўскім.

Калі Нарваўскую гміну падзяліць на тры часткі — паўднёвую „Запарожжа” з цэнтрам Тыневічы, усходнюю „Закаўказзе” з цэнтрам у Ласінцы ды паўночную (распаложаную на правым беразе ракі Нарвы) „Паўночную Беларусь” з цэнтрам у Трасцянцы, дык гэтая апошняя частка найбольш пакрыўджаная ў цэлай гміне.

Мікалай Лук’янюк

Быццам нічога не здарылася...

У маі 2005 года ў крэйдавым кар’еры ў Мельніку экскаватар у суцэльным слаі глебы адкрыў падземны ход, які нагадваў пачатак старога тунеля. Кіраўнік кар’ера загадаў засыпаць адкрыццё, каб не мець клопатаў з... археолагамі. Аператар экскаватара загад выканаў, аднак тайна хутка выцякла па-за межы кар’ера і дайшла да археолагаў і паліцыі.

Аднак на спакойнае і дэталёвае абследаванне адкрыцця было ўжо запозна: знаходка была беззваротна разбуранай.

Пасля месяца часу (!) паліцыя пачала праверку акалічнасцей здарэння, якая закончылася рашэннем аб адмове ўзбуджэння следства з-за... адсутнасці складу злачынства. Толькі пасля абскарджання гэтага рашэння беластоцкім рэстаўратарам помнікаў было ўзбуджана следства, якое цягнулася некалькі месяцаў (што ж следчыя рабілі столькі часу?), хаця ад пачатку ўсё ўсім было вядомае. У выніку адзін работнік быў абвінавачаны ў здзяйсненні злачынства, а другі — у адміністрацыйным правапарушэнні. Справай мае заняцца гродскі суд у Сямятычах, але аб прыхільную пастанову для падсудных можна не турбавацца.

У заключэнні спецыялістаў Дзяржаўнага археалагічнага музея наконт мельніцкай знаходкі чытаем: „У двух месцах экскаватары адкрылі фрагменты падземных вырабак, якія несумненна з’яўляюцца гістарычнымі помнікамі (...). Паказваюць яны на дабычу крэйды (...) Агульна можна вызначыць, што вырабкі ўзніклі ў XVIII-XIX стагоддзях (...) Тэрыторыя ў гэтым месцы моцна знішчана ў выніку сучаснай адкрытай распрацоўкі залежаў крэйды”.

Бяздумнае рашэнне кіраўніцтва кар’ера, мабыць, пазбавіла старажытны Мельнік яшчэ аднаго турыстычнага атракцыёна. Такім чынам усіх нас абакралі з часткі нашага мінулага, з нейкага фрагменту ведаў пра жыццё і працу нашых продкаў. Паўтараю: кожнага з нас абакралі з часткі мінулага! Як доўга яшчэ такога роду свядомае шкодніцтва недавучаных дурняў будзе ў нашай краіне лічыцца ўчынкам з нізкай грамадскай шкоднасцю?!

М. Ц.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714
Nakład: 1 700 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.

Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2006 r. upływa 5 czerwca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Мікалай Панфілюк

Беларусы, абудзімся!

Беларускі род,
Пойдзем мы ў ход,
Скінем сваю спячку,
Розную балячку.
Менш нам стагнаць,
А мову праслаўляць
Ад самага дзяцінства;
Прэч-далоў ляніства!
Даваць імёны родныя,
А не тыя „модныя":
Коля, Пётр і Ваня
Ды прыгожа Маня.
Будзем іх трымацца,
Да веры прызнавацца.
Кшыштаф, Збігнеў, Бася —
А муж яе Вася!
Скалацілі дом
І паняслося злом.
Не чуваць гаворкі
Роднай на падворку;
Цоканне чуваць...
Будзем мы злаваць?
Спачування трэба —
Наша ў ім патрэба.
І многія беларусы
Аказаліся трусамі;
Хоць самі праваслаўныя,
Не аказаліся слаўныя:
Дзеці апалячаны,
Духам акалечаны.
Асіміляцыя нам пагражае,
На трывогу біць заклікае.
Перад кім нам паніжацца
І на лёс злавацца?
Што пасеялі — пажнём
Цёмным днём.
А мо хочам быць ні рыбай, ні мясам
І дзівоснай „расай"?
Чаму чужая мова родная,
Ад пялёнак невыгодная?
Чаму палякі — патрыёты
Ад каралёў да галоты,
Не саромяцца свае дзяржавы?
Радзіма — іх гонар і слава.
Беларусы — абудзімся
І духова ажывімся!
Не змарнуйма шанц на свабоду
І брацца за работу!
Маем „Ніву", і радыё чуваць,
Трэба чытаць і сябе пазнаваць.
Маем барацьбітоў і яны жывуць,
Высакародны прыклад даюць,
Сваіх рук яны не апусцілі
І з намі жыць захацелі.
Возьмем прыклад з іх чым хутчэй —
Будзе нам жыць намнога лягчэй.

„Даўціпы"
Андрэя Гаўрылюка

На патанцоўцы:

— Ці ведаеш, — пытае яна, — якая розніца між танцам і звычайнай хадой?

— Не ведаю.

— Так я і падумала.

* * *

— За што сядзіш?

— За насмарк.

— ?

— Ну, так чхнуў, што аж вахцёр у банку прабудзіўся.

* * *

Жонка будзіць апоўначы мужа:

— Блыха лазіць па маіх плечах; забі яе!

— Уключы святло, — мармыча заспаны муж, — калі яна цябе ўбачыць, дык ад страху здохне.

* * *

Нарачоная да нарачонага:

— Гэтыя два словы прычыняцца да таго, што ажэнішся са мною...

— Скажаш: „Кахаю цябе"?

— Скажу: „Я цяжарная!"

Варшава — 12.03.2006



Адгаданка

1. горнае ўзвышша аднароднай геалагічнай будовы з плоскай вяршыняй або вялікая аднародная прастора напр. лесу, 2. жаночы галаўны ўбор, 3. напр. „Сялянка" Манюшкі або „Кветка шчасця" Туранкова, 4. чалавек пазбаўлены ўласных поглядаў, 5. вялікая марская жывёла або замазка для акон, 6. інструмент для праколвання адтулін у выглядзе завостранага стрыжня з дзяржальнікам, 7. правіцель эмірата, 8. птушыны „рот", 9. сталіца Вялікага княства Літоўскага. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — метафару безграшоўя.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 6 нумара

Багаж, Гана, гаць, жыхар, кудзеля, памёт, Сава, сом, суд, сума, тры, трэць, хіба, чытач, эліта.

Рашэнне: **Жудасна быць патрыётам, калі дзеля гэтага трэба стаць часам ворагам усіх чужых.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

19.03 – 25.03

Баран (21.03. — 19.04.) Пераканаешся, што сапраўды „ў марцу як у гарнцу". Няраз закіпіш ад злосці. Але нават з крайніх эмоцый можна згатаваць неблагую страву для духа. Каханая асоба не хоча папсаваць табе настрою і не шукае канфрантацыі.

Бык (20.04. — 20.05.) Калі апошнія месяцы „далі табе ў косць", адробіш сваё. Вецер дзьме ў твае ветразі, можаш здабыць тое, аб чым здаўна марыў. Калі нават штосьці пойдзе не зусім па-твойму, страты будуць невялікія.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Да 21.03. можаце быць запальчывымі і сваімі дзеяннямі падвяргнуцца сур'ёзным стратам. З аднаго боку распірае вас энергія, з другога — можаце быць не ў змозе яе выкарыстаць. Мучаць вас сумненні, апаскі, боязь. Пры спрыце справіцеся з усімі праблемамі.

Рак (22.06. — 22.07.) Магчымыя праблемы ў кантактах з іншымі людзьмі, а таксама са здароўем. Могуць наступіць падзеі, да якіх ты непадрыхтаваны, хоць даўно іх спадзяваўся. Не стаў пытання рубам і пазбягай песімістычных думак.

Леў (23.07. — 22.08.) Кемлівасць, пранікнёнасць і дысцыпліна. Справішся з найбольшымі перашкодамі. Ільвы з 25-30.07. — не вырашайце спраў звязаных з кватэрай.

Дзева (23.08. — 22.09.) Дакажаш, што шмат зможаш і адкрыюцца перад табою новыя магчымасці. Людзі будуць шукаць у цябе парад. 25.03. выйдзеш з ценю і станеш больш самастойнай.

Шалі (23.09. — 22.10.) З 23.03. цяжка будзе перамагчы спакусу добра паесці і папіць (зважайце, каб моцна не паправіцца!). Добра гуляецца на імпрэзах, але і ў кіно, на выставах. Можаце пасварыцца з нейкімі добрымі знаёмымі.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Можаш шмат дасягнуць, але толькі пры падтрымцы іншых, дык не дзяры носа ўверх. Цяжка стрымаць язык — скажаш што думаеш пра некаторыя асобы проста ў вочы, нават партнёру зможаш паказаць, дзе зімуюць ракі.

Стралец (22.11. — 21.12.) З 23.03. будзеш мець схільнасць да парожніх абяцанняў, пераборшчвання, шастання грашыма, напышлівасці. Пераканаешся, што панская ласка на рабым кані ездзіць. Не шукай парад, бо могуць цябе ўпусціць у маліны. Лішняя даверлівасць і наіўнасць могуць шмат каштаваць.

Казярог (22.12. — 19.01.) Калі чакае цябе заданне, якое патрабуе сарганізаванасці, выбірай час на гэта 23-27.03. Пераможаш сямейны крызіс. Выразная паправа ў фінансах. Не дайся ўцягнуцца ў падазроныя інтарэсы, калі нават абяцаюць табе залатыя горы.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Спакушаюць цябе няпэўныя інтарэсы, якія могуць аднак прынесці вялікі прыбытак, калі па дарозе нічога кепскага не здарыцца. Асцярожна са знаёмствамі — можа паявіцца асоба, якая на цябе зможа кепска паўплываць, хоць на вока яна без заган.

Рыбы (19.02. — 20.03.) З 23.03 будзеце энергічныя і баявітыя. Можаце пераняць ініцыятыву ў найважнейшых для вас справах, каб дасягнуць максімуму карысці. З 24.03. да 28.03. рамантычная сустрэча з кімсьці надта цікавым.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960